РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 СТУДЗЕНЯ 2025 г. АЎТОРАК № 12 (30400)

З 1 ЛЮТАГА ПАВЫШАЮЦЦА ПЕНСІІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 20 студзеня падпісаў Указ нумар 33 «Аб павышэнні пенсій».

Дакумент прадугледжвае пераразлік працоўных пенсій і іх павышэнне з 1 лютага 2025 года ў сярэднім на 10 %.

На выплату пенсій у лютым гэтага года будзе накіравана каля 2,2 млрд рублёў, з якіх 196 млн рублёў — дадатковыя расходы ў сувязі з павышэннем пенсій згодна з указам.

Як растлумачылі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, з 1 лютага павышаюцца ўсе віды працоўных пенсій: па ўзросту, за выслугу гадоў, па інваліднасці, з нагоды страты карміцеля.

Паводле папярэдняй ацэнкі, сярэдні памер пенсіі па ўзросту ў лютым 2025 г. складзе 930 рублёў. Гадавое павелічэнне (люты 2024 г. да лютага 2025 г.) складзе 120 рублёў або 14,8 працэнта.

Памер павелічэння працоўнай пенсіі ў кожнага пенсіянера будзе свой у залежнасці ад працягласці стажу і велічыні заробку, улічаных пры вылічэнні яму пенсіі, а таксама ўстаноўленых даплат да асноўнай пенсіі.

Права на надбаўкі/павышэнні маюць удзельнікі і ветэраны вялікай Айчыннай вайны, інваліды 1 групы, асобы ва ўзросце старэйшыя за 75 гадоў, ганаровыя донары і інш. Пенсіі па ўзросце вылічаюцца ў працэнтных суадносінах 55 % сярэднямесячнага адкарэкціраванага заработку за 20 гадоў стажу работы ў жанчын і 25 гадоў — у мужчын. За кожны год стажу звыш названай працягласці пенсія павялічваецца на 1 % (у межах 75 %).

«МАРАФОН АДЗІНСТВА» — У СТАЛІЦЫ

І доўжыцца ён будзе тыдзень

Грамадска-культурная акцыя «Марафон адзінства», якая ахапіла ўсю краіну, завяршаецца ў сталіцы Беларусі. Мінск стаў яго шаснаццатым пунктам. І свята тут будзе доўжыцца ажно тыдзень — штодня жыхароў і гасцей горада чакае мноства яркіх, запамінальных, цікавых падзей. Першы дзень ужо ўразіў сваёй разнастайнасцю: «НЯсумныя НЯлекцыі», адкрыццё арт-аб'ектаў, флэшмоб, канцэрт «Разам працуем, разам спяваем!»... Карэспандэнты «Звязды» завіталі на некаторыя лакацыі і ўбачылі на свае вочы, чым сёння здзіўляюць беларусы. СТАР. 8–9

ПАДЛІЧЫМ ДАХОДЫ: КАМУ ТРЭБА ПАДАЦЬ ДЭКЛАРАЦЫЮ? 11

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

НАПЯРЭДАДНІ

ТЭХНАЛОГІІ НАСУПЕРАК АНАМАЛІЯМ НАДВОР'Я

Вучоны — аб будучай пасяўной кампаніі

Нягледзячы на развіццё тэхналогій, умовы надвор'я па-ранейшаму сярод ключавых фактараў сельскагаспадарчай вытворчасці. Кліматычныя змены кідаюць выклік як аграрыям-практыкам, так і навуцы. Што супрацьпаставяць навукоўцы «нябеснай канцылярыі»? Ці можа анамальна цёплая зіма стварыць праблемы для ўраджаю азімых? І якія прагнозы на будучы сельскагаспадарчы сезон? Пра гэта «Звяздзе» распавялі ў Навукова-практычным цэнтры па земляробстве НАН Беларусі.

СТАР. 6

ISSN 1990 — 763X

Пры нашым клімаце (вы бачыце: учора — мароз, сёння — адліга) у нас праблем з дарогамі хапае. Таму патрэбныя вялізныя сродкі для таго, каб хоць бы падтрымліваць дарогі ў нармальным стане. Тым не менш мною пастаўлена задача: усе раённыя цэнтры, напрыклад Лагойск, з аграгарадкамі павінны быць звязаныя дарогамі з цвёрдым пакрыццём.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на Раждаство падчас наведвання храма святіцеля Мікалая Цудатворцаў Лагойску. 7 студзеня 2025 года.

Дапамога дарожнікам

Дарожнае будаўніцтва, як акрэсліў кіраўнік дзяржавы, адзін з прыкладаў таго, што робіцца ў нашай краіне для людзей. Стан аўтамабільных дарог — найважнейшае пытанне для жыхароў рэгіёнаў і суб'ектаў гаспадарання. Бягучы год — завяршальны ў чарговай пяцігодцы дзяржаўнай праграмы «Дарогі Беларусі». У сувязі з павелічэннем фінансавання па адзначанай дзяржпраграме расце і патрэба ў прадукцыі айчыннай вытворчасці арганізацыямі дарожнага будаўніцтва.

На Гомельшчыне найбуйнейшае дарожнае прадпрыемства па абслугоўванні аўтамабільных дарог, вуліц гарадоў і малых населеных пунктаў — камунальнае праектна-рамонтна-будаўнічае ўнітарнае прадпрыемства «Гомельаблдарбуд». Яно валодае поўным цыклам: ад праектавання і здабычы прыроднага каменя да вытворчасці вырабаў з яго і выканання дарожных і будаўнічых работ. Багатую сыравінную базу прадпрыемства забяспечвае яго структурнае падраздзяленне — друзавы завод «Глушкевічы». Гэта горадаўтваральнае прадпрыемства Лельчыцкага раёна. Інертныя матэрыялы на друзавым заводзе вырабляюцца бураўзрыўным спосабам здабычы горнай масы і яе трохстадыйным драбненнем на драбнільна-сартавальным комплексе. Сёння тут рэалізуецца знакавы для Гомельшчыны інвестыцыйны праект па выпуску інертных матэрыялаў, у тым ліку друзу дробных фракцый.

Як адзначыў **дэпутат Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў, генеральны дырэктар камунальнага праектна-рамонтна-будаўнічага ўнітарнага прадпрыемства «Гомельаблдарбуд» Ігар КРАЎЧАНКА**, у 2024 годзе старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван Крупко падтрымаў ініцыятыву «Гомельаблдарбуд» па рэканструкцыі тэхналагічнай лініі № 2 драбнільна-сартавальнага комплексу друзавага завода «Глушкевічы». Праект быў уключаны ў дзяржаўную інвестыцыйную праграму Гомельскай вобласці — з абласнога бюджэту на яго рэалізацыю выдзелена 3,25 мільёна рублёў.

— У рамках рэканструкцыі заменены ключавыя кампаненты лініі. Абсталяванне для яе закуплена ў Кітаі, але канвееры вырабілі на нашым структурным падраздзяленні КУП «Гомельаблбудкамплект». Усе пытанні па павелічэнні прадукцыйнасці, замене драбільных вузлоў, размяшчэнні ланцуга канвеернага абсталявання былі прапрацаваны з улікам навуковага абгрунтавання, — зазначыў Ігар Краўчанка. — Праведзеная рэканструкцыя дазволіць нашаму прадпрыемству ўжо сёлета прырасці на 120 тысяч тон інертных матэрыялаў. Да рэканструкцыі тэхналагічная лінія № 2 дазваляла вырабляць 200 тысяч тон розных друзавых матэрыялаў за год. Пасля правядзення рэканструкцыі яе прадукцыйнасць складзе 320 тысяч тон.

Значнасць рэканструяванай лініі і ў тым, што яна дазволіць вырабляць друз дробных фракцый, такіх як 5—10 мм, запатрабаваных у дарожным будаўніцтве.

— Гэта значна спросціць работу дарожных службаў, якія выкарыстоўваюць адзначаны матэрыял для ямачнага рамонту і павярхоўнай апрацоўкі дарожнага пакрыцця. Раней друз падобнай фракцыі мы альбо закуплялі, альбо спрабавалі вырабляць самастойна, але гэта патрабавала спынення работы лініі, разбору абсталявання і, як вынік, зніжала прадукцыйнасць вытворчасці. Праведзеная рэканструкцыя дазваляе атрымліваць гэты від прадукцыі ў пастаянным рэжыме, — дадаў Ігар Краўчанка.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ІНТЭНСІЎНАСЦЬ СУПРАЦОЎНІЦТВА НЕАБХОДНА ПАДТРЫМЛІВАЦЬ

Прэзідэнты Беларусі і Расіі правялі тэлефонную размову. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмяняліся віншаваннямі з вялікім святам Хрышчэння Гасподняга. Прэзідэнт Расіі папрасіў перадаць найлепшыя пажаданні беларускаму народу, павіншаваць усіх праваслаўных беларусаў.

Абмеркавалі і актуальныя рабочыя пытанні двухбаковага ўзаемадзеяння. Інтэнсіўнасць беларуска-расійскага супрацоўніцтва ва ўсіх сферах, як падкрэслілі лідары, неабходна падтрымліваць.

Дамовіліся кіраўнікі дзяржаў і аб далейшых кантактах.

МЕРКАВАННІ

ЯКАСЦЬ ПАВІННА СТАЦЬ КРЭДА НАШАГА ЖЫЦЦЯ

Абвешчаная Указам Прэзідэнта пяцігодка якасці ўсіх без выключэння нацэльвае на стваральную працу і на вынік. Аб гэтым сёння разважаюць нашы эксперты-парламентарыі.

Алег Раманаў:

«У ПЯЦІГОДКУ ЯКАСЦІ ВЕЛЬМІ ВАЖНА ПАВЫШАЦЬ УЗРОВЕНЬ КАМПЕТЭНЦЫІ НАШЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ»

«Якасць — гэта залог нашага выжывання», — адзначыў **дэпутат Палаты прадстаўнікоў, старшыня РГА «Белая Русь», старшыня Беларускай партыі «Белая Русь» Алег РАМАНАЎ.** «Канкурэнцыя на знешніх рынках становіцца ўсё больш жорсткай, і для таго каб упэўнена займаць на іх свае нішы і паспяхова асвойваць новыя рынкі, беларусам трэба быць канкурэнтаздольнымі. А за кошт чаго? За кошт высокай якасці прадукцыі. Калі яна будзе, тады нашы прадпрыемствы могуць працаваць нармальна, загружаць свае магутнасці, даваць супрацоўнікам дастойную заработную плату — усё, што трэба чалавеку і дзяржаве», — наогул ён першую прычыну, па якой правядзенне пяцігодкі якасці неабходна менавіта цяпер.

Другая прычына, на думку Алега Раманава, у тым, што Беларусь ужо дасягнула годнага ўзроўню жыцця, які задавальняе патрэбнасці людзей. Але ёсць не толькі ўзровень жыцця, ёсць якасць жыцця. «Якасць жыцця звязана з узроўнем адукацыі, медыцыны, сацыяльных праграм. Якасць жыцця — гэта экалогія, бяспека, дзяржаўнае кіраванне. І для таго каб нашы людзі жылі дастойна, трэба павышаць якасць работы ва ўсіх сферах жыццядзейнасці грамадства. У пяцігодку якасці вельмі важна павышаць узровень кампетэнцыі нашых спецыялістаў. Сёння трэба асвойваць новыя тэхналогіі, новыя віды тэхнікі і вытворчасцяў і тым самым выходзіць на больш высокі ўзровень прамысловага, тэхналагічнага развіцця краіны», — падкрэсліў Алег Раманаў. Ён заявіў, што партыя і грамадскае аб'яднанне «Белая Русь» будуць рэалізоўваць новыя праекты, звязаныя з добраўпарадкаваннем у розных населеных пунктах краіны. «Белая Русь» не застанецца ў баку ад той маштабнай работы па добраўпарадкаванні краіны, якая праводзіцца цяпер і будзе праводзіцца надалей», — запэўніў Алег Раманаў.

Ірына Даўгала:

«АСВОІМ ЯКАСЦЬ — ЗДАБУДЗЕМ І КОЛЬКАСЦЬ»

Ірына ДАЎГАЛА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі мяркуе:

— Недастаткова толькі выканаць работу — яе трэба выканаць якасна. Менавіта такі пасыл ідзе ад нашага Прэзідэнта больш за тры дзесяцігоддзі суверэнітэту Беларусі. Усе гэтыя гады наш лідар імкнуўся да таго, каб не проста насыціць таварамі і паслугамі ў першую чаргу ўнутраны рынак (а тады, у 1990-я, гэта было жыццёва неабходна), але і прасоўваць беларускую прадукцыю на знешніх рынках. Аднак гэта магчыма толькі пры ўмове выключна якаснай прадукцыі. Таму аб'яўленне Прэзідэнтам пяцігодкі якасці толькі яшчэ раз падкрэсліла стратэгічнае бачанне нашага лідара: якасць — гэта паказчык адказнасці Беларусі і яе імідж на міжнароднай арэне.

Асаблівым для нашай краіны стаў 2024 год, аб'яўлены кіраўніком дзяржавы Годам якасці. Прэзідэнт адразу адзначыў: «Хачу, каб вы разумелі: якасць — гэта не толькі пра эканоміку і вытворчасць. Гэта, перш за ўсё, пра чалавека». Вядома ж, не будзем хаваць, што Год якасці — гэта курс на мадэрнізацыю, тэхнічнае пераабсталяванне вытворчасцяў незалежна ад галіновай прыналежнасці і формы ўласнасці.

Вынікі не прымусілі сябе чакаць — якасць беларускай прадукцыі стала брэндам. Вытворчасць прадукцыі, якая не проста адпавядае попыту і чаканням самых капрызных спажыўцоў, але і дазваляе вытворцам быць упэўненымі ў заўтрашнім дні, стварае імідж і аўтарытэт, дае штуршок для далейшага развіцця.

Якасць прадукцыі — найлепшая гарантыя вернасці спажыўца. Гэта найбольш надзейная абарона ад канкурэнцыі і адзіны шлях да ўстойлівага росту і прыбыткаў, а значыць, напаўненне дзяржаўнага бюджэту, у тым ліку для выканання дзяржавай сваіх сацыяльных гарантый для неабароненых пластоў насельніцтва.

Але чалавек быў і застаецца тым, дзеля каго патрэбна гэта самая якасная прадукцыя. У жыцці ўсё ўзаемазвязана. Якасць нашага жыцця традыцыйна звязваецца з узроўнем дабрабыту чалавека ці краіны ў цэлым, аднак сучасныя рэаліі ўсё часцей прымушаюць звяртацца да таго, што якасць неабходная ва ўсім.

Ад якасці работы нашага заканадаўства, а значыць, ад работы парламента, залежыць якасць нашага жыцця: як своечасова будуць прымацца тыя ці іншыя законапраекты, наколькі яны будуць якаснымі ў правапрымяняльнай практыцы і садзейнічаць прасоўванню нашай эканомікі і іншых сфер нашай жыццядзейнасці.

Для жыцця людзей, а гэта значыць, кожнага з нас, работы любой сферы неабходна ў першую чаргу бяспека. Якасная бяспека, бо ніхто з нас нават не задумваецца, як саміх сябе засцерагчы ад якіх-небудзь пагроз, для гэтага ў нас ёсць сілавы блок на чале з Галоўнакамандуючым. Гэта яны забяспечваюць усім нам, падкрэслю, якасную бяспеку.

Каб усе сферы працавалі як гадзіннік, патрэбны прафесійныя кадры, а значыць, якасная сістэма адукацыі. Мы ўсе жадаем быць здаровымі — патрэбна якасная сістэма аховы здароўя. Жадаем прасоўваць тэхналогіі — патрэбна якасная навука.

Словам, куды не кінеш позірк, усюды якасць выходзіць, як кажуць, на пярэдні план.

Так што нам не варта гнацца за колькасцю, а важна дабівацца якасці. Як толькі мы асвоім абсалютна ўсюды якасць, здабудзем і колькасць.

Таму пяцігодка якасці павінна стаць крэда жыцця кожнага беларуса.

САМАЕ ГАЛОЎНАЕ — ЗДАРОЎЕ ГРАМАДЗЯН

У Мінску пасля мадэрнізацыі адкрылі сучасную паліклініку

Сістэме аховы здароўя ў нашай краіне ўдзяляецца асаблівая ўвага. Беларуская медыцына ні ў чым не саступае замежнай. Гэта пацвярджаюць шматлікія ўнікальныя аперацыі, а таксама тое, што даволі часта адкрываюцца і рэканструююцца медыцынскія ўстановы сусветнага ўзроўню. Так, для павышэння якасці аказання медыцынскай дапамогі Мінскім гарвыканкамам было прынята рашэнне аб мадэрнізацыі 2-й цэнтральнай паліклінікі. І 18 студзеня Фрунзенскі раён атрымаў выдатны аб'ект са спецыялізаванымі аддзяленнямі і самым сучасным медыцынскім абсталяваннем.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў горадзе Мінску Наталля КАЧАНАВА, якая прысутнічала на адкрыцці, назвала гэту падзею важнай не толькі для Фрунзенскага раёна, але і ў цэлым для сталіцы. Па яе словах, 2025 год — асаблівы для горада Мінска: ужо з самага яго пачатку ўведзены ў эксплуатацыю важныя і патрэбныя для жыхароў сталіцы аб'екты. Зусім нядаўна Прэзідэнт адкрыў тры новыя станцыі метро, быў ажыццёўлены перавод усяго горада на падземнае водазабеспячэнне, і ў мінчан з'явілася якасная пітная вада. І вось пасля мадэрнізацыі адкрываецца выдатная паліклініка.

Спікер Савета Рэспублікі зрабіла акцэнт на тым, што з боку кіраўніка дзяржавы аддаецца вялікая ўвага сістэме аховы здароўя: «Мы разумеем, што здароўе людзей — вельмі важна. І гэта ўстанова дазволіць жыхарам Фрунзенскага раёна атрымліваць больш кваліфікаваную медыцынскую дапамогу. Для работнікаў гэтай паліклінікі створаны цудоўныя ўмовы, паколькі мы разумеем, што тыя людзі, якія аддаюць часцінку сваёй душы і сэрца, сапраўды маюць патрэбу ў добрых умовах для працы і, вядома, у сучасным медыцынскім абсталяванні.

«І грамадзяне, і супрацоўнікі — усе ў захапленні ад таго, што мы нарэшце ўводзім гэты доўгачаканы аб'ект, — падзяліўся **галоўны ўрач установы Мікалай ТРУБЧЫК**. — Ён выдатны і ў плане абсталявання, і ў плане інтэр'еру, і ў плане вонкавага выгляду, і, вядома ж, тут сканцэнтравана якаснае медыцынскае абсталяванне, створаны ўсе ўмовы і магчымасці для таго, каб якасна аказваць медыцынскую дапамогу».

Пасля азнаямлення з работай установы **міністр аховы здароўя Аляксандр ХАДЖАЕЎ** расказаў журналістам аб перспектывах далейшай работы ў рамках пяцігодкі якасці. Пачаў, вядома, з увядзення гэтай паліклінікі: «Гэта паліклініка — найбольш высокатэхналагічная ўстанова горада Мінска. Тут будуць сканцэнтраваны спецыялісты па ўсіх кірунках пачынаючы ад хірургіі, траўматалогіі, а таксама і дыягнастычнае абсталяванне такога ўзроўню, як КТ і МРТ. Выконваючы даручэнне кіраўніка дзяржавы аб даступнасці і якасці медыцынскай дапамогі, горад Мінск, уводзячы ў строй гэтую паліклініку, якраз-такі і дамагаецца тых мэт, якія перад намі пастаўлены».

Аляксандр Хаджаеў дадаў: «На сённяшні момант тая задача, якая пастаўлена кіраўніком дзяржавы ў рамках ужо пяцігодкі якасці, патрабуе ад нас звышматывацыі і звышсіл для таго, каб мы змаглі тое, што маем, зрабіць самай лепшай якасці. Мы прыкладзём для гэтага ўсе сілы. Сёння для гэтага ёсць як працоўныя, так і матэрыяльныя рэсурсы. Гэта значыць, усё тое, што кіраўнік дзяржавы ўкладвае ў сацыяльна арыентаваную дзяржаву, павінна мець у сістэме аховы здароўя самы высокі стандарт. Мы да гэтага будзем не толькі імкнуцца, але ў штодзённым фармаце старацца гэта забяспечваць».

Міністр аховы здароўя адзначыў, што ў 2025 годзе ў горадзе Мінску плануецца да ўводу восем аб'ектаў сістэмы аховы здароўя, чатыры з іх — паліклінікі.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

НАЙЛЕПШЫЯ ТЭХНАЛОГІІ І НОВЫЯ ПРАЦОЎНЫЯ МЕСЦЫ

У Вілейцы наладзілі вытворчасць сыроў з белай цвіллю

На базе Вілейскага вытворчага ўчастка ААТ «Мінскі малочны завод № 1» адбылося адкрыццё ўчастка вытворчасці сыроў з белай цвіллю. Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця аб'екта ўзялі ўдзел кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Дзмітрый КРУТОЙ і старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Генеральны дырэктар ААТ «Мінскі малочны завод № 1» Тамара ЧЫЧЫРА заўважыла: «Сёння вельмі важны дзень не толькі для холдынга, але і для ўсёй малочнай галіны нашай краіны. Можна сказаць, што сёння мы ўзнялі беларускі сцяг на вяршыню гары вытворцаў сыру з белай цвіллю. Я ўпэўнена, што нашы спажыўцы ацэняць новы прадукт і ён зойме сваё пачэснае месца на стале кожнага беларуса». Па словах гендырэктара, магутнасць вытворчага ўчастка — тры тоны ў суткі, 90 тон у месяц: «Цяпер мы плануем адпрацаваць тэхналогію сыру Camembert, у далейшых планах — выпуск сыру «Бры» і, магчыма, іншых варыянтаў. Плануецца, што на вытворчасць будзе паступаць малако з малочнатаварнай фермы, якую ўвялі ў раёне ў мінулым годзе».

Пасля азнаямлення з новай вытворчасцю кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Дзмітрый Крутой адзначыў, што будаўніцтва такіх аб'ектаў — гэта годна і самавіта: «Калі казаць пра сыр, то кухары, якія ўжо з ім пазнаёміліся і пачалі працаваць, упэўненыя, што ў рэжыме сляпой дэгустацыі наш сыр нічым не саступае ні расійскім, ні французскім аналагам. На вытворчасці самае сучаснае абсталяванне, найлепшыя тэхналогіі, на адпрацоўку якіх сышло шмат месяцаў. Канчатковы прадукт дазваляе казаць, што гэтыя намаганні спецыялістаў акупіліся цалкам».

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта падкрэсліў, што гэты праект з'яўляецца добрым прыкладам у рамках ініцыятывы «Адзін раён — адзін праект»: «Прэзідэнт, будучы на «Дажынках» у Валожыне, азнаёміўшыся з вынікамі работы падобных раённых цэнтраў, запатрабаваў значна ўзмацніць гэту праграму. Ён даручыў на працягу года планаваць яго графік такім чынам, каб асабіста паглядзець гэтыя праекты, якіх сёння ўжо каля 200».

Дзмітрый Крутой звярнуў увагу, што стварэнне новай вытворчасці ў Вілейцы ў эквіваленце склала дзесяць мільёнаў долараў, дазволіла стварыць амаль 50 новых працоўных месцаў, забяспечваючы сваіх супрацоўнікаў добрым заробкам у 2,5-3 тысячы рублёў: «Гэта добрая зарплата нават па мерках сталіцы і іншых абласных цэнтраў. Будуць таксама вырашаны пытанні з жыллём, з дапамогай нашага малочнага холдынга будзе адноўлены інтэрнат, забяспечана замацоўвальнасць спецыялістаў. Таму па комплексе атрыманых эфектаў гэты праект не проста паспяховы — ён суперпаспяховы, асабліва для такіх раённых цэнтраў, як Вілейка».

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

г. Вілейка.

ДЛЯ БУДУЧЫХ УРАЧОЎ

Новы корпус БДМУ з сімуляцыйна-атэстацыйным цэнтрам адкрылі ў сталіцы

Новы практыка-арыентаваны корпус Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта дасць магчымасць павысіць стандарты і эфектыўнасць медыцынскай адукацыі.

Пра гэта заявіў на ўрачыстым адкрыцці корпуса **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.** Ён адзначыў, што для сістэмы медыцынскай адукацыі гэта знакавая падзея:

— Тут будуць рыхтавацца дактары і правізары. Аснашчэнне, укаранёнае ў практыка-арыентаваны корпус, дазволіць якасна асвойваць вучэбную праграму з выкарыстаннем усіх перадавых тэхналогій.

Віцэ-прэм'ер нагадаў, што рашэнне аб стварэнні корпуса было прынята Прэзідэнтам на сустрэчы са студэнтамі і выкладчыкамі ў БДМУ. Тады прагучала прапанова аб будаўніцтве корпуса для павышэння якасці медыцынскай адукацыі і павелічэння экспарту адукацыйных паслуг. Гэтая прапанова была падтрымана, і корпус пабудавалі ў самыя кароткія тэрміны.

— Дзяржава ўклала 67 млн рублёў для таго, каб стварыць камфортныя ўмовы для заняткаў, для прафесарска-выкладчыцкага складу і, вядома, каб абсталяваць корпус па апошнім слове тэхнікі. Тут задзейнічаны інфармацыйныя тэхналогіі і штучны інтэлект. Мы спадзяёмся, што гэта дазволіць рэалізаваць практыка-арыентаваны падыход і глыбінныя навуковыя распрацоўкі, што ўмацуе нацыянальную і дэмаграфічную бяспеку, — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Па словах Ігара Петрышэнкі, традыцыі адукацыі ў сферы аховы здароўя ў нашай краіне маюць глыбокія карані і з кожным годам становяцца больш якаснымі. Ён выказаў надзею, што адкрыццё корпуса яшчэ далей прасуне сістэму медыцынскай адукацыі, бо для будучых медыкаў створаны выдатныя ўмовы.

— Час выбраў нас, і нам трэба будзе развіваць сістэму аховы здароўя і адукацыі, быць годнымі грамадзянамі нашай краіны, — падкрэсліў ён.

Дарэчы, новы практыка-арыентаваны корпус Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта разлічаны на 1 тысячу навучальных месцаў і абсталяваны сучаснымі тэхналогіямі для падрыхтоўкі будучых медыкаў. У будынку арганізаваны віртуальная лабараторыя і 4D-зала, якія дазваляюць мадэляваць розныя надзвычайныя сітуацыі.

Акрамя таго, у аўдыторыі для будучых стаматолагаў устаноўлены трэнажоры-сімулятары, што дае магчымасць адначасова навучацца 36 студэнтам. Падобныя інавацыйныя модулі створаны і для іншых медыцынскіх спецыяльнасцяў.

Па матэрыялах БелТА.

ФІЛАСОФІЯ СТАНАЎЛЕННЯ

У Нацыянальнай бібліятэцы прэзентавалі кнігу

Аўтарскі калектыў дакументальна-біяграфічнага нарыса — Аляксандр Радзькоў, Наталля Эйсмант, Уладзімір Пярцоў і Аляксандр Карлюкевіч — не ставіў перад сабой задачу напісаць біяграфію Аляксандра Лукашэнкі, а тым больш раскрыць пэўныя шакавальныя кулуары палітычнага жыцця. Ключавы лейтматыў — нагадаць, які шлях прайшоў і кожны дзень праходзіць наш Прэзідэнт, паказаць, колькі нацыянальны лідар зрабіў і працягвае рабіць для нашай краіны, кожнага беларуса.

Кніга, якая выйшла ў выдавецтве «Беларусь», складаецца з трох раздзелаў: «Старт у вялікае жыццё» (пра найбольш асабістае: карані, дзяцінства, вучобу ва ўніверсітэце, службу ў савецкай арміі і г. д.), «Справа ўсяго жыцця — Беларусь» (паказаны кірункі развіцця краіны, якім Прэзідэнт удзяляе вялікую ўвагу) і «Прэзідэнтамі нараджаюцца...» (аб мудрасці жыццёвых даро г, міжнароднай тэматыцы, сяброўстве Аляксандра Лукашэнкі з сусветнымі лідарамі, падзеях няпростага 2020 года). Той, хто возьме ў рукі ўнікальнае выданне, азнаёміцца і з эксклюзіўнымі матэрыяламі: патрымае ў руках копіі дакументаў з прэзідэнцкага архіва — яго камсамольскую характарыстыку, студэнцкую залікоўку, рукапісы тэзісаў, зробленых падчас падрыхтоўкі да найважнейшых падзей, і інш.

«СТВАРАЦЬ ТАКІЯ МАТЭРЫЯЛЫ ЖЫЦЦЁВА НЕАБХОДНА»

«Вельмі важна ў чалавека, які возьме ў рукі гэту кнігу, выклікаць пачуццё датычнасці да прэзідэнцкай работы, яго лёсу», — падкрэсліла **прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля ЭЙСМАНТ**, якая расказала, як ствараласа ўнікальнае выданне.

Па яе словах, кіраўнік дзяржавы працяглы час нічога не ведаў аб гэтай рабоце. «Многія людзі, якія працуюць побач з Прэзідэнтам і не толькі, цудоўна ведаюць адносіны нашага Прэзідэнта да падобнага кшталту матэрыялаў, твораў аб ім, — звярнула ўвагу прэс-сакратар беларускага лідара. — Ніякага «ваяздзізму» — гэта наш лозунг і дэвіз. У нас на падобныя рэчы адназначнае табу. Мы ўсе разумеем, што кніга аб Прэзідэнце — гэта тая кніга, якую кожны будзе разглядаць пад мікраскопам. У першую чаргу сам Прэзідэнт, нашы людзі, апаненты. І ўсё ж, нягледзячы на ўсе гэтыя абставіны, пасля доўгага часу пошуку, сумненняў мы за гэту справу выраішылі ўзяцца».

У жніўні 2024 года кніга (як здавалася аўтарам, ужо ў цалкам падрыхтаваным выглядзе) лягла на галоўны працоўны стол нашай краіны. «Мы ведаем, Прэзідэнт кнігу паглядзеў: не было ніякіх ацэнак, ніякіх рэакцый, — распавяла Наталля Эйсмант. — Было адзінае даручэнне — гэту кнігу павінны пачытаць людзі, розныя людзі: розных узроставых, сацыяльных груп, людзі нашы, людзі палітычна нейтральныя. Натуральна, мы даручэнне Прэзідэнта выканалі. Гэту кнігу пачыталі праграміст і пенсіянер, дэпутат і дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі, кіраўнік аднаго з нашых цэнтральных СМІ, пачыталі профільныя эксперты па розных кірунках. У кожнага чалавека з тых, хто глядзеў гэту кнігу, былі свае заўвагі, прапановы — яны падышлі вельмі адказна. Натуральна, у многім мы ўлічылі гэтыя заўвагі. Удзел у рабоце над гэтай кнігай прымала вялікая колькасць людзей — гэта яшчэ такая і экспертна-народная праца».

На думку Наталлі Эйсмант, ствараць такія матэрыялы цяпер жыццёва неабходна. «Неабходна фіксаваць тое, што мы бачым аб чалавеку, з якім нам пашчасціла працаваць, — удакладніла яна. — Нашы апаненты, скажам мякка, нафантазіруюць, напрыдумляюць, схлусяць. Пытанне стаіць у тым — што мы з вамі гэтаму супрацьпаставім? Што мы пакінем для наступных пакаленняў? Менавіта таму такія кнігі павінны быць».

ЛІДАРСКІЯ ЯКАСЦІ, ЗАКЛАДЗЕНЫЯ ПРЫРОДАЙ

Прадбачачы пытанне аўдыторыі, чаму менавіта кніга, **заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, доктар педагагічных навук, прафесар Аляксандр РАДЗЬКОЎ** адзначыў, што ў адрозненне ад сродкаў масавай інфармацыі і сацыяльных сетак кніга — гэта філасофія. «У гэтай рабоце — філасофія станаўлення, развіцця асобы на зразумелых і відавочных для ўсіх мінулым і, я ўпэўнены, будучыні асобы, кіраўніка нашай дзяржавы, — канкрэтызаваў ён. — Прырода закладвае кожнаму народжанаму на зямлі дзіцяці свае задаткі, свае асаблівасці і сваю перспектыву. Камусьці быць вялікім мастаком, камусьці — вялікім матэматыкам, а камусьці — добрым слесарам або шахцёрам. Прырода закладвае яшчэ і лідарскія якасці. Усіх гэтых і аграномаў, і інжынераў, і навукоўцаў, і пісьменнікаў, і мастакоў трэба арганізаваць, каб яны сумесна вырашалі задачу развіцця вытворчасці, краіны, дзяржавы і ў цэлым нават цывілізацыі».

Па яго словах, у Аляксандра Лукашэнкі лідарскія якасці закладзены ад нараджэння. «Чалавек, якога прырода вызначыла, узначаліў краіну, стаў лідарам нацыі, — звярнуў увагу Аляксандр Радзькоў. — І ён гэта сам паслядоўна разумеў». І аўтар кнігі пацвердзіў гэта на канкрэтных прыкладах з розных жыццёвых этапаў кіраўніка дзяржавы. Воля, прага ведаў, арганізаванасць, вызначэнне аўтарытэтных людзей, якіх трэба паслухаць, адказнасць у прыняцці рашэнняў — адны з тых рыс, якія вызначаюць лідарскія якасці Прэзідэнта.

> **«Мы хацелі асобу нашага Прэзідэнта максімальна зразумець, асэнсаваць і прапанаваць філасофію яго асобы, — адзначыў Аляксандр Радзькоў. — Мы закладвалі ў гэту філасофію тое, што ён рабіў, што робіць і будзе рабіць разам з намі. Спадзяёмся, філасофію асобы, якой мы ганарымся, данеслі правільна».**

Па словах **дырэктара выдавецтва «Беларусь», старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандра КАРЛЮКЕВІЧА**, гартаючы старонкі кнігі «Наш Прэзідэнт», па-новаму пачынаеш глядзець на суверэнную Рэспубліку Беларусь, спалучаючы яе старонкі з асобай Аляксандра Лукашэнкі. «Хацелася б, каб такія эмоцыі былі асабліва ў маладых чытачоў, — удакладніў ён. — Гэта дапаможа ўзброіцца іншым пунктам гледжання, убачыць, якіх намаганняў каштуе пабудаваць краіну, як у многім яе развіццё залежыць ад фарміравання асобы. Жадаю, каб эмоцыі, атрыманыя ў ходзе прачытання, дапамаглі здзейсніць шмат годных учынкаў у імя нашага, як кажа Прэзідэнт, кавалка зямлі, любімай суверэннай Беларусі».

КНІГА КОЖНАГА ПАТРЫЁТА

Як заўважыў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ПЯРЦОЎ**,

«ГЭТА ЛЮДЗІ, У ЯКІХ ЁСЦЬ І ЖАДАННЕ,

На прэзідэнцкія выбары акрэдытавана 456 міжнародных назіральнікаў з 49 краін свету

Такую лічбу паведамілі ў Міністэрстве замежных спраў. У іх ліку — парламентарыі з краін СНД і далёкага замежжа, прадстаўнікі цэнтральных выбарчых органаў замежных дзяржаў, рэгіянальных органаў улады, дыпламатычнага корпуса, незалежныя эксперты. «Што датычыцца міжнародных арганізацый, нашы запрашэнні атрымалі Выканкам і Міжпарламенцкая асамблея СНД, Парламенцкая асамблея АДКБ, Парламенцкі сход Саюзнай дзяржавы, Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва, Сакратарыят Нарады па ўзаемадзеянні і мерах даверу ў Азіі, маладзёжная арганізацыя Руху недалучэння. Запрашэнне было таксама накіравана Бюро па дэмакратычных інстытутах», — сказана ў паведамленні МЗС.

У ведамстве падкрэслілі, што па добрай традыцыі для ўсіх назіральнікаў будуць створаны роўныя ўмовы, якія дазволяць ім чарговы раз пераканацца ў нашай адкрытасці, транспарэнтнасці і, вядома ж, на свае вочы ўбачыць міралюбівую і гасцінную Беларусь.

Некаторыя назіральнікі ўжо ў гэтым пераканаліся. Місія назіральнікаў ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў апублікавала прамежкавую справаздачу аб ходзе назірання за падрыхтоўкай выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — з 18 студзеня місія ажыццяўляе маніторынг падрыхтоўкі выбараў. У прамежкавай справаздачы сцвярджаецца, што выбары праводзяцца на аснове палажэнняў Канстытуцыі, Выбарчага кодэкса, іншых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь, а таксама пастаноў Цэнтральнай выбарчай камісіі, якія растлумачваюць асобныя працэдуры арганізацыі выбарчай кампаніі. Члены місіі адзначаюць, што кандыдаты і іх давераныя асобы для сваёй агітацыйнай кампаніі выкарыстоўваюць усе прадстаўленыя заканадаўствам спосабы. Значная частка агітацыйнай работы перадвыбарнымі штабамі кандыдатаў вядзецца з выкарыстаннем розных інтэрнэт-рэсурсаў і сацыяльных сетак. На думку місіі, агітацыйная кампанія праходзіць спакойна і арганізавана, у строгай адпаведнасці з патрабаваннямі выбарчага заканадаўства. «Кандыдатам створаны роўныя ўмовы для перадвыбарнай агітацыі і забяспечана права выступлення ў сродках масавай інфармацыі, — гаворыцца ў справаздачы. — Свае канчатковыя высновы і ацэнкі місія выкладзе ў падагульняльным дакуменце па выніках маніторынгу падрых-

Тым часам

«Я ПРЫЙДУ — МОЙ ГОЛАС ПЕРШЫ!»

Учора БРСМ даў старт рэспубліканскай акцыі для грамадзян, якія галасуюць упершыню — «Твой голас першы». У гандлёвым цэнтры «Першы Нацыянальны гандлёвы дом» сабралася каля 200 актыўных грамадзян, якім упершыню будзе дадзена права галасавання на выбарах Прэзідэнта Беларусі. Спецыяльным запрошаным госцем мерапрыемства стаў Улад Кабякоў, папулярны відэаблогер, выканаўца, тэлевядучы, шоумен. Ён расказаў удзельнікам мерапрыемства аб асабістым першым вопыце ўдзелу ў электаральнай кампаніі, падзяліўся думкамі і эмоцыямі, а таксама прапанаваў маладым людзям паўдзельнічаць у флэшмобе — разам з тымі, хто ўпершыню галасуе, запісаў памятнае матывавальнае відэа. Пракрычаўшы фразу «Я прыйду — мой голас першы!», удзельнікі дружна паабяцалі ўсёй краіне, што яны абавязкова прыйдуць на выбарчыя ўчасткі і ўпершыню пакінуць голас у падтрымку свайго кандыдата.

«Акцыя будзе рэалізоўвацца ва ўсіх рэгіёнах, — адзначыла каардынатар акцыі Юлія Кірпічэнка. — На ўсіх выбарчых участках краіны будуць працаваць пункты ўручэння эксклюзіўных падарункаў ад БРСМ для тых, хто ўпершыню галасуе. Яны атрымаюць брэндаваныя футболкі з назвай акцыі. А з 21 студзеня да 3 лютага пройдзе анлайн-конкурс «Моладзь галасуе!». Для ўдзелу неабходна зрабіць тэматычную фатаграфію і выкласці яе з 21 да 26 студзеня ўключна ў сацыяльных сетках са спецыяльнымі хэштэгамі і тэкстам, які апісвае, чаму ўдзел у выбарах важны».

ЛІДАРА

«Наш Прэзідэнт»

кніг аб кіраўніках дзяржаў дастаткова вялікая колькасць і гэта разнажанравыя выданні.

«Дзесьці чыстай вады біяграфія, дзесьці — публіцыстыка, фотаальбомы, дзесьці — набор цытат з розных сродкаў масавай інфармацыі, нават публікацыі з аднаго агенцтва, але гэта быў не наш шлях, — удакладніў ён. — Наша кніга багатая не толькі на дакументальна-біяграфічныя нарысы, уяўляючы маналітны нарыс, які складаецца з трох частак. Яна багатая на вялікую колькасць дакументальных матэрыялаў, якія знаходзяцца ў архівах Адміністрацыі Прэзідэнта, прэс-службы Прэзідэнта, інфармацыйнага агенцтва БелТА, іншых выдавецтваў і сродкаў масавай інфармацыі».

Уладзімір Пярцоў удакладніў, што ў кнігу ўвайшло толькі 10 % матэрыялаў 30-гадовай напружанай работы Прэзідэнта, якія адлюстроўваюць асабістую ініцыятыву кіраўніка дзяржавы, штуршок усім тым здзяйсненням, якія адбыліся ў Беларусі і зрабілі нашу краіну такой, якая яна ёсць. Адлюстраваны аспекты, звязаныя ў цэлым з міжнароднай архітэктурай.

Па перакананні намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, кніга створана для розных пакаленняў, у тым ліку для моладзі. Ён парэкамендаваў набыць яе ў калекцыю кожнага патрыёта. І зрабіць гэта можна ўжо сёння — набыць кнігу «Наш Прэзідэнт» можна ў сталічных крамах «Першы» і «Светач». Плануецца, што яна з'явіцца ў кніжных крамах і за мяжой, у тым ліку на англійскай мове.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

І МАГЧЫМАСЦІ»

тоўкі і правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».

А ў той жа час БДІПЧ АБСЕ заявіла, што не зможа накіраваць сваіх назіральнікаў у Беларусь. У арганізацыі адзначылі, што запрашэнне паступіла ўсяго за 10 дзён да выбараў, што нібыта «перашкаджае доступу» місіі да ключавых этапаў электаральнай кампаніі і робіць немагчымым паўнавартаснае назіранне. «Як гаворыцца, ёсць жаданне — ёсць тысячы магчымасцяў. Калі няма жадання, то ёсць тысячы прычын», — адрэагавала на гэта беларускае Міністэрства замежных спраў у сацсетцы X.

Тым часам у аўторак, 21 студзеня, пачне работу цэнтр грамадскага назірання за выбарамі. Прадстаўнікі найбуйнейшых грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый краіны зноў аб'ядноўваюць намаганні для сумеснай работы па назіранні за ходам галасавання. Пачынаючы з першага дня датэрміновага галасавання пачне работу Цэнтр грамадскага назірання за выбарамі, дзе будзе акумулявацца інфармацыя ад назіральнікаў аб ходзе галасавання і магчымых пазаштатных сітуацыях. Грамадскімі аб'яднаннямі, палітычнымі партыямі ўжо вылучана каля 30 тысяч назіральнікаў. Яны акрэдытаваны практычна на ўсіх участках у кожным рэгіёне Беларусі.

Дарэчы

ЖУРНАЛІСТАЎ БУДЗЕ ШМАТ

Асвятляць выбары ў Беларусі плануюць найбуйнейшыя сусветныя медыя. Як паведамілі ў Міністэрстве інфармацыі, усяго ў інфацэнтр ЦВК акрэдытавана 812 журналістаў. «Міністэрства інфармацыі Беларусі сумесна з МЗС завяршылі апрацоўку заявак на акрэдытацыю журналістаў для работы ў інфацэнтры ЦВК. Усяго доступ у інфармацыйны цэнтр у Палацы Рэспублікі атрымаў 481 прадстаўнік з 24 беларускіх медыя і 331 журналіст з 70 замежных СМІ. Замежныя медыя будуць прадстаўлены з 23 краін Азіі, Еўропы, Лацінскай і Паўночнай Амерыкі, Блізкага Усходу», — адзначылі ў ведамстве.

Традыцыйна высокую цікавасць праявілі прадстаўнікі расійскіх медыя. Акрамя таго, свае заяўкі на акрэдытацыю накіравалі як вядучыя сусветныя СМІ — BBC, Reuters (Вялікабрытанія), Al Jazeera (Катар), Медыякарпарацыя Кітая (CCTV і CGTN), ТАСС, УДТРК (Расія), CNN, Associated Press (ЗША), AFP (Францыя), так і буйныя рэгіянальныя медыя — TeleSUR (Венесуэла), ZDF, ARD (Германія), EFE (Іспанія), France Televisions (Францыя).

ВЫНІКІ З ПЛЮСАМ

Дзмітрый ПАНТУС:

«Па аб'ёме прамысловай вытворчасці за 2024 год дасягнуты рэкордныя лічбы»

За 2024 год па аб'ёме прамысловай вытворчасці былі дасягнуты рэкордныя лічбы. Пра гэта ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1» паведаміў старшыня Дзяржкамваенпрама Дзмітрый Пантус. Ён таксама расказаў аб найноўшых распрацоўках ДВПК, прынятых на ўзбраенне ў беларускае войска, а таксама аб перспектыўных кірунках — у прыватнасці як ідзе стварэнне першага беларускага лёгкаматорнага самалёта «Асвей».

ІМПАРТАЗАМЯШЧЭННЕ НА МІЛЬЁНЫ

Дзмітрый Пантус адзначыў, што мінулы год для Дзяржкамваенпрама быў вельмі напружаным:

— З улікам геапалітычнай абстаноўкі прыйшлося працаваць адначасова адразу па шырокім спектры кірункаў і мерапрыемстваў. Але, нягледзячы на ўсю складанасць года, ён быў, на нашу думку, і вельмі прадукцыйным для нас.

Так, кіраўнік адзначыў, што па аб'ёме прамысловай вытворчасці былі дасягнуты рэкордныя лічбы:

— У тым ліку паказчык па экспарце. Быў узяты чарговы рэкорд за ўсю гісторыю сістэмы Дзяржкамваенпрама. Мы імпартазамясцілі дэталі, вузлы і работы, якія выкарыстоўваліся пры стварэнні сучасных відаў узбраення, на суму каля 147 мільёнаў долараў. І гэта за апошнія гады такая сур'ёзная лічба.

ВЫШЭЙ ЗА АБЛОКІ!

Што датычыцца планаў на неба, то доследны ўзор самалёта «Асвей» плануюць вырабіць у наступным годзе.

— Адной з важных падзей 2024 года для нас стаў старт рэалізацыі праекта па стварэнні самалёта «Асвей» у кааперацыі з расійскімі партнёрамі. На сёння гэты праект афіцыйна запушчаны на дзяржаўным узроўні. І ўжо ў 2026 годзе мы плануем атрымаць доследны ўзор, — расказаў Дзмітрый Пантус.

Паводле яго слоў, гэты праект дазволіць вельмі сур'ёзна прасунуцца ў сферы авіябудавання.

— І фактычна ўпершыню стварыць школу ў гэтай частцы ў Рэспубліцы Беларусь. Таму што да гэтага моманту такой школы ў нас не было. У нас быў усяго толькі вопыт рамонту і мадэрнізацыі самалётаў ваеннага прызначэння, — дапоўніў старшыня Дзяржкамваенпрама.

Дарэчы, упаўнаважанымі органамі (дзяржаўнымі заказчыкамі) бакоў, адказнымі за рэалізацыю доследна-канструктарскай работы па распрацоўцы самалёта «Асвей», вызначаны Дзяржаўны ваенна-прамысловы камітэт Рэспублікі Беларусь і Міністэрства прамысловасці і гандлю Расійскай Федэрацыі, галаўным выканаўцам з расійскага боку — АТ «Уральскі завод грамадзянскай авіяцыі», сувыканаўцам ад беларускага боку — ААТ «558 Авіяцыйны рамонтны завод».

ПРЫНЯТЫ НА ЎЗБРАЕННЕ

ДВПК працуе над стварэннем зенітна-ракетнага комплексу блізкага дзеяння, паведаміў Дзмітрый Пантус:

— На мой погляд, галоўнай падзеяй 2024 года, галоўным вынікам для Дзяржкамваенпрама стала стварэнне айчыннага зенітна-ракетнага комплексу сярэдняй далёкасці Бук-МБ2 з айчыннай ракетай. Над стварэннем гэтай ракеты мы працавалі некалькі гадоў, і 2024-ы быў годам усіх выніковых практычных выпрабаванняў дадзенага вырабу.

Ён канстатаваў, што ДВПК удалося ва ўстаноўленым парадку скончыць комплекс разам з айчыннай на 100 % ракетай. І на сённяшні момант ужо ва ўстаноўленым парадку комплекс прыняты на ўзбраенне Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

— Дзякуючы таму, што нам удалося распрацаваць і стварыць гэтыя вырабы, мы ўжо глядзім наперад у гэтым кірунку і цяпер працуем над стварэннем комплексу блізкага дзеяння, у аснову якога ўвойдуць тыя ўніфікаваныя рашэнні, якія атрымаліся ў нас у частцы стварэння комплексу сярэдняй далёкасці.

Таксама прайшоў паспяховыя выпрабаванні і ў снежні прыняты на ўзбраенне гранатамётны комплекс «Сапфір».

— Вельмі сур'ёзнай вяхой у 2024 годзе для нас стала стварэнне гранатамётнага комплексу «Сапфір». У канцы года мы скончылі ўсе выпрабаванні і правялі іх вельмі паспяхова. У снежні загадам міністра абароны выраб ва ўстаноўленым парадку быў прыняты на ўзбраенне, — канстатаваў кіраўнік.

Адзначым, што першы айчынны гранатамётны комплекс «Сапфір» прызначаны для барацьбы з бранятэхнікай, паразы жывой сілы праціўніка, якая знаходзіцца ў бункерах, лёгкіх хованках палявога тыпу і збудаваннях гарадскога і сельскага тыпаў. Зыходзячы з асаблівасцяў гранатамётнага комплексу «Сапфір», у першую чаргу наяўнасці электроннай сістэмы кіравання пускам і праграмавальнага выбуховага прыстасавання, адзначаецца вялікі патэнцыял па адаптацыі комплексу на баявыя модулі, рабатызаваныя агнявыя комплексы і беспілотныя лятальныя апараты.

У ЧАКАННІ «МІРАТВОРЦА»

Акрамя гэтага, Дзмітрый Пантус паведаміў, што завяршаюцца даследчыя выпрабаванні беспілотнага авіяцыйнага комплексу «Міратворац».

— У 2024 годзе два вырабы — разведвальны комплекс «Беркут-3» і ўдарны комплекс «Чакан» — былі прыняты афіцыйна, пастаўлены на ўзбраенне ва Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь. Мы завяршылі таксама комплекс мерапрыемстваў па пастаноўцы іх на ўзбраенне і правялі ўсе этапы выпрабаванняў. І ў верасні ўсе беспілотныя комплексы, зробленыя айчыннымі распрацоўшчыкамі, былі прадстаўлены кіраўніку дзяржавы. Гэты паказ таксама прайшоў досыць паспяхова, — падкрэсліў Дзмітрый Пантус.

Паводле яго слоў, цяпер працягваецца работа па стварэнні новых комплексаў.

— У пачатку 2025 года завершацца даследчыя выпрабаванні БАК «Міратворац», які таксама, я думаю, будзе ва ўстаноўленым парадку пастаўлены на ўзбраенне, — рэзюмаваў старшыня Дзяржкамваенпрама.

Па матэрыялах БелТА і sb.by

Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона	
Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2
Продавец	ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23. УНП 807000270
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**)

Предмет электронного аукциона

Месторасположение**: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 69**

№ лота	Наименование	Начальная цена с НДС 20%, руб.
1	PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, АР 8134-7, 2010 г. в.	**14 853,58**
2	PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, АР 8175-7, 2011 г. в.	**14 916,59**
3	PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, АР 8128-7, 2011 г. в.	**14 854,99**
4	PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, АР 8105-7, 2011 г. в.	**14 912,76**
5	VOLKSWAGEN TRANSPORTER RUCAR, AI 3973-7, 2009 г. в.	**16 690,46**
6	PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, АР 9573-7, 2011 г. в.	**14 887,75**
7	VOLKSWAGEN TRANSPORTER, АР 8202-7, 2008 г. в.	**12 467,92**
8	VOLKSWAGEN TRANSPORTER, г/н АР 8203-7, 2008 г. в.	**11 300,47**

Цена снижена на 30%

Задаток 10 % от начальной цены предмета торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ»; БИК BELBBY2X. Получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390.

Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после торгов.

Условия оплаты предмета электронных торгов: оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона размещено на странице лота во вкладке «Документы». Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену.

Победитель электронных торгов, либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения торгов.

Предыдущее извещение опубликовано в г. «Звязда» 19.12.2024.

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 31.01.2025 с 11.00 до 12.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 30.01.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. Email: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению филиала «Острошицкий Городок» открытого акционерного общества «Агрокомбинат «Дзержинский» (продавец), проводит открытый аукцион по продаже **одним лотом недвижимого имущества в составе:**

здание коровника с выгульной площадкой с инв. № 600/С-171279 общей площадью 1 898,3 кв.м;

склад комбикорма, инв. № 600/С-171211, общей площадью 23,6 кв. м;

сенажная траншея № 2 д. Пухляки (2000 т.) *(составные части и принадлежности: боковая стенка)***, инв. № 600/С-171332, общей площадью 963,3 кв. м;**

навозохранилище, инв. № 600/С-171799, общей площадью 1989 кв. м.

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623685800001000468 площадью 1,2659 га ***(право постоянного пользования)*** **по адресу: Минская область, Минский район, Шершунский с/с, район д. Пухляки.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона р. Гуйка, пл. 1,2659 га; охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,0020 га.

Начальная цена с НДС (20%) **– 802 136,66** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 80 213,00** бел. руб.). Стоимость снижена на 5 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330 000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 14.06.2024.

Аукцион состоится **05.02.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.02.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320. Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) 136-31-11, 102-21-17. Тел. для осмотра: (8017) 504-83-58, (8029) 116-45-00.**

УНП 601088558

ТЭХНАЛОГІІ НАСУПЕРАК АНАМАЛІЯМ НАДВОР'Я

УРАЎНЕННЕ З МНОГІМІ НЕВЯДОМЫМІ

— Сцвярджаць, што цёплая зіма гэтага года — адназначна дрэнна для азімых, не дакладна, — адзначае **загадчык лабараторыі рэгуляцыі росту і развіцця раслін НПЦ па земляробстве НАН Беларусі, кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт Уладзімір ХАЛАДЗІНСКІ**. — Ды і называць умовы перазімоўкі 2024—2025 «анамальна цёплымі» пакуль заўчасна. Напрыклад, у 2020 годзе кліматычная зіма ў нашай краіне наогул не наступіла (тэмпература паветра так і не апусцілася ніжэй 0° С). Што датычыцца ўплыву на азімыя культуры, тут ёсць як плюсы, так і мінусы. Да станоўчых аспектаў адносіцца мінімізацыя рызыкі пашкоджання раслін марозам. Расліны расходуюць менш пластычных рэчываў (цукроў), назапашаных перад «сыходам у зіму», а значыць, пры аднаўленні вегетацыі іх рост будзе больш актыўны. На фоне цёплага надвор'я ў апошнія гады ў раслін назіраецца млявая вегетацыя: нягледзячы на зіму, усе функцыі арганізма «ўключаны», ідзе назапашванне цукроў і рост каранёвай сістэмы, што вельмі важна для любой культуры. І ўсё гэта працуе на будучы ўраджай. Да адмоўных фактараў аднясём у першую чаргу павышэнне колькасці шкодных арганізмаў (узбуджальнікаў хвароб, насякомых-шкоднікаў, пустазелля), якія раней у значнай ступені гінулі пры прамярзанні глебы, паніжэнні тэмпературы, наяўнасці снежнага покрыва.

Пакуль будучы ўраджай непакою не выклікае, кажа навуковец. Але наперадзе ў нас яшчэ паўтара месяца зімы і вясна.

— У апошнія гады для Беларусі больш крытычна вясновае вяртанне халадоў на фоне аднаўлення вегетацыі раслін. Інтэнсіўны рост прадугледжвае зніжэнне ахоўных функцый, і пры зваротных замаразках пашкоджанні могуць быць істотнымі, — адзначае Уладзімір Халадзінскі. — А ў цэлым, не бывае аднолькавых гадоў, нейкі фактар заўсёды будзе мяняцца, так што прагнозы ў нашай сферы — справа няўдзячная. Правільней своечасова ацаніць сітуацыю і правесці тэхналагічныя аперацыі для зніжэння ўздзеяння неспрыяльных фактараў асяроддзя.

ПАДЫХОД — ІНДЫВІДУАЛЬНЫ

Як сучасныя тэхналогіі зніжаюць рызыкі, звязаныя з непрадказальнасцю надвор'я?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Беларусь знаходзіцца ў «зоне рызыкоўнага земляробства», дзе рэдка складваюцца спрыяльныя для росту і развіцця раслін умовы, — падкрэслівае суразмоўца. — Усё часцей мы назіраем засухі, ліўні, якія суправаджаюцца моцным парывістым ветрам, познія вясновыя замаразкі, нетыповыя для нашага клімату тэмпературы. Так, у мінулым верасні ў некаторых рэгіёнах (у прыватнасці ў Магілёўскай вобласці) не выпала ні міліметра ападкаў, і азімыя сеялі літаральна ў пыл. Зразумела, спецыялісты прыкладалі максімум намаганняў, каб мінімізаваць шкоду, але ўмовы надвор'я ўносяць карэктывы.

Калі казаць пра агратэхніку, то ў сучасных умовах найважнейшы фактар поспеху — аптымальныя тэрміны сяўбы, лічаць навукоўцы.

— Адносна яравых — чым раней мы іх пасеем, тым больш вільгаці ў іх будзе для прарастання, развіцця каранёвай сістэмы, асабліва ў паўднёвых рэгіёнах, — тлумачыць Уладзімір Халадзінскі. — Летась на поўдні краіны сяўба яравых пачалася ў лютым. Справа ў тым, што для азімых можна даць дастаткова дакладныя рэкамендацыі па аптымальных тэрмінах сяўбы — мы гэтае пытанне пастаянна вывучаем, і, заўважу, за апошнія дзесяць гадоў гэтыя тэрміны ссунуліся ў сярэднім на два тыдні (для паўночных рэгіёнаў — са жніўня на верасень, для паўднёвых — яшчэ далей у восень). А для ранніх яравых, такіх як ячмень, авёс, усё інакш: іх пачынаюць высейваць, калі праграванне глебы на глыбіні 10 см дасягае +5°С, і прывязаць сюды каляндарныя даты немагчыма.

А вось спазніцца з тэрмінамі сяўбы вельмі лёгка, і спазненне — адзін з фактараў, што лімітуе ўраджайнасць. Калі мы спазняемся на два тыдні, зніжэнне ўраджайнасці ў параўнанні з аптымальнымі тэрмінамі сяўбы можа скласці да 30 %. І тут важна асобна разглядаць кожны раён і нават кожнае канкрэтнае поле.

— Гаворка пра «дакладнае земляробства»?

— Дакладнае земляробства актыўна ўкараняецца ў тым ліку як адказ на выклікі, звязаныя са зменнем клімату.

На ўзроўні дзяржавы праводзіцца лічбавізацыя землекарыстання, ствараецца банк электронных карт палёў, дзе для кожнага поля за шэраг гадоў захоўваюцца ўсе паказчыкі і аперацыі, якія там праводзіліся. Гэта дазволіць у далейшым прымаць найбольш рацыянальныя рашэнні для кожнага канкрэтнага выпадку, у перспектыве — у тым ліку з удзелам штучнага інтэлекту.

Але маштабная лічбавізацыя землекарыстання — толькі першы этап. Наступны (і ён таксама ўжо актыўна рэалізоўваецца) — сістэма навігацыйнага кантролю тэхнікі, якая дазваляе дамагчыся стабільна высокай якасці ўсіх тэхналагічных аперацый. У меншай ступені прымяняюцца пакуль у Беларусі сістэмы дыферэнцыраванага ўнясення ўгнаенняў і пестыцыдаў. Але і ў гэтым кірунку ўжо ёсць прыклады паспяховай работы. У нашай краіне гэты элемент тэхналогіі дакладнага земляробства стрымлівае вялікая стракатасць палёў: нават у межах аднаго ўчастка можа быць да 10—15 глебавых адрозненняў з розным утрыманнем элементаў харчавання, кіслотнасцю і г. д. Гэта вызначаецца шляхам адбору проб і аналізу іх у лабараторных умовах. Ужо распрацаваны механізаваныя пробаадборнікі, якія палегчаць і паскораць гэты працэс. Ёсць таксама распрацоўкі, што даюць магчымасць з дапамогай мультыспектральнай камеры ацаніць утрыманне элементаў харчавання ў самой расліне. Далей праграма разлічвае неабходную колькасць рэчыва для ўнясення на кожны квадратны метр, у глебу альбо на расліну.

І, нарэшце, яшчэ адзін фактар поспеху — селекцыйная работа.

— Ураджайнасць збожжавых, кармавых, тэхнічных культур — паказчык комплексны. Дакладнае выкананне тэхналагічных аперацый, пачынаючы з падбору сорту — залог атрымання максімальнай прадукцыйнасці, — рэзюмуе Уладзімір Халадзінскі.

Арыентавацца сельгаспрадпрыемствам навукоўцы раяць на насенне айчыннай селекцыі. Беларускія сарты створаны ў нашых умовах і адаптаваны да іх, а на этапе дзяржсортавыпрабавання ацэньваецца патэнцыял іх прадукцыйнасці і вызначаюцца рэгіёны, дзе яны найбольш поўна яго рэалізоўваюць.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

МАЛАДЗЁЖНАЯ ПАЛІТЫКА

ТАЛЕНТЫ, ШТО КРАІНУ СЛАВЯЦЬ

Як у Беларусі падтрымліваюць адораную моладзь

Падтрымка найбольш таленавітай і матываванай моладзі, стварэнне спрыяльных умоў для паспяховай вучобы, навуковай і творчай дзейнасці былі і застаюцца прыярытэтнымі для кіраўніка дзяржавы. У студзені 2025-га Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне выдзеліць з рэзервовага фонду Прэзідэнта Br680 тыс. на заахвочванне адораных навучэнцаў і студэнтаў, а таксама асоб, якія іх падрыхтавалі.

У лік шчасліўчыкаў заслужана трапілі 26 лаўрэатаў грандпрэміі, якім будзе ўручаны нагрудны знак «Лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы здольных навучэнцаў і студэнтаў» і 217 лаўрэатаў спецыяльных прэмій — пераможцаў Рэспубліканскіх алімпіяд і конкурсаў. Узнагароджанне за асаблівы ўклад у развіццё здольнасцяў адораных навучэнцаў і студэнтаў атрымае 21 педагагічны работнік. Акрамя таго, за выдатную вучобу, поспехі ў навукова-даследчай і творчай дзейнасці 173 студэнтам і курсантам устаноў вышэйшай адукацыі прызначана Стыпендыя Прэзідэнта Беларусі.

— Здольных дзяцей не было б, калі б у іх не было здольных настаўнікаў, — упэўнена **начальнік аддзела па суправаджэнні работы з адоранымі навучэнцамі Акадэміі адукацыі Юлія ПАШКЕВІЧ**. Яна падкрэсліла, што дзейнасць акадэміі арыентавана на работу менавіта з такімі выкладчыкамі і будуецца на прынцыпах кампетэнтнасці, камунікатыўна-дзейнага, асобаснаарыентаванага, культуралагічнага падыходаў для таго, каб сапраўды стварыць цэласную сістэму работы з адоранымі навучэнцамі. Для гэтага акадэміяй праводзіцца шмат цікавых і карысных мерапрыемстваў.

Падрыхтоўка каманд да міжнародных алімпіяд — адна са сфер дзейнасці акадэміі. Зборы для ўдзельнікаў, як правіла, праводзяцца ў Нацыянальным дзіцячым аздараўленчым цэнтры «Зубраня» і доўжацца з красавіка да ліпеня. Адпачынак у маляўнічым месцы ў дзяцей праходзіць у перапынках паміж заняткамі, якія праводзяць з імі найлепшыя выкладчыкі краіны. Вынік вялікай сумеснай работы школьнікаў і іх настаўнікаў уражвае — за апошнія пяць гадоў на міжнародных алімпіядах па вучэбных прадметах заваявана 262 медалі, з іх 45 залатых, 91 сярэбраны і 126 бронзавых. У 2024 годзе 63 школьнікі прынялі ўдзел у 13 міжнародных спаборніцтвах, і 56 з іх сталі пераможцамі і прызёрамі, прынёсшы роднай краіне 18 залатых, 13 сярэбраных і 25 бронзавых медалёў.

У БДУ таленавітых дзяцей, уключаных у банк адораных навучэнцаў, якія ўжо сталі студэнтамі, адразу бяруць «на аловак». Кожнаму з іх прадастаўляецца індывідуальны куратар, які пачынае выбудоўваць адукацыйную і навуковую траекторыю студэнта.

— З такімі навучэнцамі мы працуем на сістэмнай аснове, — расказвае **першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Дзмітрый КУРЛОВІЧ**. — Далучаем да гэтай дзейнасці абітурыентаў, студэнтаў, выпускнікоў, магістрантаў, аспірантаў і тых, хто застаецца працаваць ва ўніверсітэце.

Па яго словах, значная частка гэтай работы таксама прыпадае на адораных дзяцей — удзельнікаў рэспубліканскіх алімпіяд. Выкладчыкі выступаюць у якасці распрацоўшчыкаў, затым членаў журы, кіраўнікоў каманд, якія рыхтуюць алімпійцаў на зборах да міжнародных алімпіяд. Некаторыя з іх з'яўляюцца і кіраўнікамі каманд, што возяць школьнікаў на міжнародныя спаборніцтвы. Дзмітрый Курловіч дзеліцца: яму самому пашчасціла быць уцягнутым у гэты этап.

А яшчэ ён прывёў такія лічбы — у БДУ функцыянуюць 66 студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый і 122 студэнцкія навуковыя гурткі, у якіх студэнты робяць першыя крокі ў навуку. Найбольш моцным ва ўніверсітэце Дзмітрый Курловіч называе ІТ-кірунак.

Алена ВІНАГРАДАВА.

АДУКАЦЫЯ

ЛЮБОЎ ДА ЗЯМЛІ СА ШКОЛЬНАЙ ПАРТЫ

Як школьнікі Докшыцкага раёна далучаюцца да сельскай гаспадаркі

З года ў год расце прэстыж сельскагаспадарчых прафесій, і нездарма, бо сёння краіна будуе сучасныя малочнатаварныя комплексы, аўтаматызуе вытворчыя працэсы на прадпрыемствах, а сучасныя камбайны па ўзроўні камфорту ўвогуле могуць паспаборнічаць з навінкамі легкавога аўтапрама. Тым не менш, любоў да працы на зямлі і ўсведамленне важнасці аграрнай галіны ў развіцці Беларусі трэба прывіваць з дзяцінства. Гэтым паспяхова займаюцца педагогі Параф'янаўскай сярэдняй школы, што ў Докшыцкім раёне.

Цяпер у невялікай сельскай школе вучацца каля 100 школьнікаў. Факультатывы і гадзіны грамадскай карыснай працы дзеці разам з настаўнікамі праводзяць за вывучэннем агратэхналогій, сельскагаспадарчай тэхнікі. А своеасаблівы школьны гарод радуе не толькі класічнымі бульбай-морквай-капустай, але і паласатымі гарбузамі, і лекавымі раслінамі. У дзвюх цяпліцах школьнікі вучацца вырошчваць памідоры, у мінулым сезоне пасеялі 1,5 гектара збожжа, у планах на наступны — пасадзіць каля пяці кілаграмаў фасолі.

Як расказала настаўнік працоўнага навучання Вольга Сазановіч, «брэндам» установы адукацыі, без сумнення, з'яўляецца цыбуля. Здаўна на школьным гародзе вырошчвалі сорт «Штутгартэр», пазней прыйшлі і да модных «Алонса», «Экспібішэн», «Рэд барон». Тэхналогіі вырошчвання і сакрэты высокіх ураджаяў дзеці пад кіраўніцтвам настаўніка апісваюць у даследчых работах. Адна з іх, напрыклад, нядаўна ўзяла «бронзу» на рэспубліканскім узроўні.

Прычым хімічным угнаенням тут катэгарычна кажуць «не», бо гародніна, вырашчаная ў школе, ідзе ў першую чаргу на харчаванне для дзяцей, у другую — на сельскагаспадарчыя кірмашы ўстаноў адукацыі. Прадукцыю Параф'янаўскай СШ ужо добра ведаюць у раёне, а на атрыманыя сродкі школа самастойна праводзіць рамонт, умацоўвае матэрыяльна-тэхнічную базу. Пасля таго, як цыбулю сабралі з поля, участак засейваюць жытам, а па перыметры высаджваюць аксаміткі, бо гэтых кветак баіцца галоўны вораг гэтай гародніны — цыбульная муха.

Профільныя класы аграрнага кірунку з'явіліся на Віцебшчыне ў 2018 годзе, з года ў год іх колькасць расце. Сёння магчымасць навучацца ў такіх класах і групах у Докшыцкім раёне маюць навучэнцы Сітцаўскай, Парплішчанскай, Крулеўшчынскай, Глінскай і Параф'янаўскай школ. У чатырох агракласах і трох аграгрупах навучаюцца 34 школьнікі, адметнасць такой спецыялізацыі — наведванне сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, аграсуботы і прафарыентацыйныя злёты моладзі.

Праз год трое дзесяцікласнікаў Параф'янаўскай школы скончаць установу адукацыі і свой аграрны клас. На тое, каб абраць менавіта гэты кірунак для вывучэння ў выглядзе факультатываў, у кожнага школьніка былі свае прычыны. Напрыклад, у Івана Мароза бацька працуе трактарыстам-машыністам у Докшыцкім райаграсэрвісе, а бабуля займаецца развядзеннем цялят. Бацькі Карыны Галавашка таксама працуюць у галіне сельскай гаспадаркі, а Насця Шаўчэнка ўжо вызначылася з будучай прафесіяй: дзяўчына плануе паступаць у аграрную ВНУ. Будучыя выпускнікі ўпэўнены: тое, што яны змаглі вывучыць з пятага класа аб працы на зямлі, абавязкова ім спатрэбіцца не толькі ў прафесіі, але і ў паўсядзённым дарослым жыцці.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота «Витебские вести».

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. Сайт в интернете: www.cpo.by
Продавец	ОАО «Сбер Банк», 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 32А-1
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by

Лот №1 – капитальное строение, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 19Б/5.	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.:
Магазин (здание специализированное розничной торговли), общей площадью 1176,8 кв. м, инвентарный номер 500/С-22967.	483 929,57

Сведения о земельном участке с кадастровым номером 500000000009009107: предоставлен на праве аренды (доля в праве 131/625) для строительства и обслуживания зданий специализированных розничной торговли, зданий неустановленного назначения, здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ общей площадью 7.7327 га.

Лот № 2 — имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Пушкина, 172	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.:
1. Здание банка (здание нежилое) общей площадью 2124,2 кв.м., инвентарный номер 710/С-52251. Составные части и принадлежности: подвал. **2. Помещение гаражей** (помещение гаражей), общей площадью 41,6 кв. м, инвентарный номер 710/D-54201. **3. Складское помещение** (складское помещение), общей площадью 41,3 кв. м, инвентарный номер 710/D-54202.	1 212 540,00

Дополнительная информация по лоту№2: при приобретении предмета аукциона, победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона на сумму **89 437,70 белорусских рублей с НДС 20%**. Состав имущества и цены размещены на сайте организатора аукциона www.cpo.by и www.ipmtorgi.by.

Сведения о земельном участке с кадастровым номером 741000000006001659: предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания Первомайского отделения ОАО «Белпромстройбанк» в г. Бобруйске, общей площадью 0,2969 га.

Задаток 10% от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа **ЗАО «Центр промышленной оценки»**.

Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после электронных торгов.
Условия оплаты предмета электронных торгов: не более 30 дней со дня заключения договора купли-продажи.

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,7%** от цены продажи лотов №1,2 в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов.

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона
с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия.

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов лота №1 опубликовано в г. «Звязда» от 15.08.2023 г., лота № 2 от 03.12.2024 г.

Дата и время начала и окончания электронных торгов	Начало торгов — 10 ч.00 мин. **03.02.2025 г.** Окончание торгов — 12 ч. 00 мин. 03.02.2025г**.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
Дата и время окончания приёма заявок	Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 31.01.2025 г. до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by
Контактные телефоны:	Тел: +375 (17)310-36-37; +375 (44) 704-92-06 Email: auction@cpo.by

Гомельский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»
(Организатор аукциона) информирует

о проведении повторного открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды части здания железнодорожного вокзала, находящегося в собственности Республики Беларусь и хозяйственном ведении РУП «Гомельское отделение Белорусской железной дороги»

Дата проведения аукциона: 30 января 2025 г. в 10.00.
Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 2-7.

№ лота	Наименование объекта аренды, цель его использования	Арендуемая площадь,(м²)
1	**Часть здания железнодорожного вокзала,** инв.№340/С-291171, на 1-ом этаже (для организации розничной торговли)	12,2

Местонахождение объекта аренды:
Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Привокзальная.

Начальная цена продажи права заключения договора аренды: 54,17 рублей. Задаток: 54,17 рублей.
Коэффициент к базовой ставке арендной платы в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды от сдачи в аренду составляет **3,0.**
Срок договора аренды: 3 года, начиная со дня заключения договора аренды. Шаг аукциона: 5 %.

Местонахождение организатора аукциона, его контакты: г. Гомель, ул. Артёма, 23, т. +375(232)32-46-47, 32-18-95, +375(29) 170-46-47, сайт: www.ino.by, e-mail: gomel@ino.by.

Извещение о проведении аукциона опубликовано 17.01.2025 г. на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и Гомельского областного исполнительного комитета gomel-region.by. УНП 401166490

«МАРАФОН АДЗІНСТВА» — У СТАЛІЦЫ

АСАБЛІВАЯ ЎВАГА — МОЛАДЗІ

— Кожны дзень у нас будуць мерапрыемствы ў навучальных установах, на прадпрыемствах. Упадабаныя і традыцыйныя майстар-класы ад артыстаў Прэзідэнцкага аркестра і Вялікага тэатра Беларусі зноў парадуюць гледачоў. Упершыню пройдзе майстар-клас артыстаў Купалаўскага тэатра ў Акадэміі мастацтваў, — расказала напярэдадні кіраўнік рабочай групы па арганізацыі і правядзенні «Марафону адзінства» Ганна Лукашэнка.

Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ дадаў, што нашы суайчыннікі з вялікай адказнасцю паставіліся да падрыхтоўкі марафону. Удзел прынялі ўсе слаі грамадства. «Мы вельмі шмат атрымлівалі прапаноў. Радуе, што многія дзіцячыя, творчыя, маладзёжныя арганізацыі таксама ўдзельнічаюць. Безлічы прапаноў ад прадпрыемстваў, арганізацый, творчых калектываў, навучальных устаноў, якія робяць усё для таго, каб паказаць, што мы разам, мы адзіная», — адзначыў кіраўнік горада.

Па словах Уладзіміра Кухарава, праграма марафону ахоплівае больш за 70 пляцовак, уключаючы 15 выставак дасягненняў Беларусі за апошнія тры дзесяцігоддзі. Асаблівая ўвага — маладзёжным ініцыятывам, паведаміў мэр.

УНУТРАНЫ СВЕТ — ПРАЗ ПАДАРУНАК

Адна з самых незвычайных выставак у рамках «Марафону адзінства» — экспазіцыя падарункаў Прэзідэнту «З любоўю і падзякай». Яна адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Як звярнула ўвагу **прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля ЭЙСМАНТ,** гэта беспрэцэдэнтны выпадак, калі экспанаты выехалі з Палаца Незалежнасці. «І, як паказаў час, гэта цудоўная ідэя арганізатараў марафону», — удакладніла яна.

У Музеі Палаца Незалежнасці — мноства падарункаў ад замежных лідараў, сяброў нашага Прэзідэнта, гасцей Беларусі. Але асаблівая ўвага надвальнікаў музея накіравана на падарункі, уручаныя беларускаму лідару працоўнымі калектывамі. «Мы цудоўна ведаем, што Прэзідэнт шмат ездзіць па краіне, наведвае шмат прадпрыемстваў, дзейна, прадметна ўдзельнічае ў жыцці, развіцці кожнага з іх, — адзначыла Наталля Эйсмант. — Натуральна, візіт Прэзідэнта на тое ці іншае прадпрыемства — гэта заўсёды вельмі важнае мерапрыемства. І працоўны калектыў хоча Прэзідэнта нечым парадаваць, пакінуць нешта на памяць аб гэтым візіце. Усе падарункі перадаюцца ў Палац Незалежнасці».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па словах **генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзіма ГІГІНА,** гэта ўжо не першы вопыт узаемадзеяння Нацыянальнай бібліятэкі і Палаца Незалежнасці. «Яшчэ адна выстаўка, якая праехала па ўсёй краіне, — гэта «Кнігі ў дар Прэзідэнту», — нагадаў ён. — Унікальная калекцыя, унікальны збор выданняў, падораных кіраўніку дзяржавы не толькі замежнымі палітыкамі, дзяржаўнымі дзеячамі, але і грамадскімі дзеячамі, журналістамі, творчымі асобамі. Яна дапамагае раскрываць і ўнутраны свет Прэзідэнта, і нашу эпоху. Роўна тое ж мы можам сказаць аб выстаўцы падарункаў кіраўніку дзяржавы».

ПОГЛЯД ЗА ГАРЫЗОНТ

Акцыя сустракае гасцей сталіцы і праводзіць вандроўнікаў выстаўкай НАН Беларусі «Погляд за гарызонт», якая адкрылася на чыгуначным вакзале.

Беларуская навука арыентавана на вырашэнне найбольш важных і надзённых рэспубліканскіх і галіновых народна-гаспадарчых задач, адзначыў на адкрыцці выстаўкі **галоўны вучоны сакратар Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Васіль ГУРСКІ.**

«Мы можам ганарыцца лазернай тэхнікай, якую вырабляе ДНВА «Оптыка, оптаэлектроніка і лазерная тэхніка» не толькі для патрэб краіны, але і на экспарт (у тым ліку лазеры для медыцыны, буйныя прамысловыя лазеры). А таксама лінейкай датчыкаў і сэнсараў, якія вырабляе Інстытут радыёматэрыялаў, — яны дазваляюць будаваць у тым ліку велікагрузныя аўтамабілі: БелАЗы і МАЗы. Актыўна развіваецца сёння таксама кірунак мікраэлектронікі», — падкрэсліў прадстаўнік Акадэміі навук.

Наведвальнікі выстаўкі могуць убачыць штучныя ізумруды, якія вырошчваюць у лабараторыі НПЦ НАН Беларусі па матэрыялазнаўстве, прывезены з Антарктыды мінерал узростам 4,5 млрд гадоў, палярную бесплотную сістэму паветранага маніторынгу для назірання за дрэйфам айсбергаў і пошукава-ратавальных работ, мадэлі касмічных апаратаў і многае іншае. Размешчана экспазіцыя ў зале чакання і працаваць будзе з 11.00 да 20.00 да 26 студзеня ўключна.

АПОРА НА ТРАДЫЦЫІ

Выстаўка «Зямля таленавітых людзей» у гандлёвым цэнтры «Першы Нацыянальны гандлёвы дом» расказвае аб іншым аспекце беларусаў — іх здольнасці захоўваць і развіваць культурную спадчыну.

ДВГА «Белмастацпромыслы» дорыць мінчанам і гасцям сталіцы магчымасць пазнаёміцца з унікальнымі вырабамі, створанымі айчыннымі майстрамі. Тут можна ўбачыць і розныя тэхнікі лоза- і саломапляцення, і вырабы з дрэва, і «Сожскую скань» ад гомельскай фабрыкі мастацкіх вырабаў «Любна»... Навукова-вытворчае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства беларускіх народных рамёстваў «Скарбніца» даследуе і адраджае касцюмы з розных рэгіёнаў Беларусі.

«ВЫБАР — ЁН МОЙ»

Тэма выбару, які людзі робяць кожны дзень, стала лейтматывам «НЯсумнай НЯлекцыі» ў Мінскім дзяржаўным каледжы аўтамабілебудавання. **Намеснік міністра адукацыі Кацярына ПЯТРУЦКАЯ** пацікавілася ў юнакоў і дзяўчат, ці часта ім даводзіцца рабіць выбар у жыцці, ці гатовыя яны аддаць свой выбар іншаму чалавеку. Размова атрымалася шчырай. Да яе далучыўся **намеснік генеральнага дырэктара ААТ «МАЗ» Генадзь ТУМІЛОВІЧ.** Падчас НЯлекцыі Кацярына Пятруцкая прапанавала: калі сумна — можна сыходзіць. Але за дзве гадзіны, якія праляцелі неверагодна хутка, нікому не захацелася не тое што сысці — нават зайсці ў сацыяльныя сеткі.

СПЯВАЮЦЬ УСЕ!

Наступны прыпынак марафону — Мінскі маторны завод. Знайсці месца правядзення мерапрыемства было нескладана з-за гучных апладысментаў работнікаў, якіх запрасілі на канцэрт «Разам працуем, разам спяваем!». На сцэне ззялі зоркі нашай эстрады: Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры», Тэа і Вольга Рыжыкава, Ганна Благава...

Канцэрты таксама прайшлі ў цэхах ЗАТ «Атлант» і Мінскага завода колавых цягачоў. **Спявачка Ганна ТРУБЯЦКАЯ** пасля выступлення на «Атланце» падзялілася, што такія канцэрты для яе заўсёды асабліва дарагія: «Я з вялікім задавальненнем бяру ў іх удзел, бо для мяне выступіць на заводзе, для людзей, якія фарміруюць будучыню нашай краіны ў розных галінах, — вельмі ганарова. Гэтыя людзі занятыя сваёй работай, яны вырабляюць якасную прадукцыю, як і патрабуе наш Прэзідэнт. Таму мне радасна прыйсці да іх на працоўнае месца і праспяваць ім свае песні, паглядзець у вочы. Атмасфера тут асабліва, а апладысменты самыя гучныя і шчырыя».

УНЁСАК У КУЛЬТУРНУЮ СКАРБОНКУ

Тым часам па адрасах Прытыцкага, 152 і Навінкаўская, 2 адкрылі арт-аб'екты «Будучыня Беларусі ў тваіх руках». Муралы з'явіліся дзякуючы сумесным намаганням Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў БРСМ, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта і Мінскага гарадскога штаба студэнцкіх атрадаў БРСМ. Яны сімвалізуюць адзінства маладога пакалення, якое ўпэўнена трымае ў сваіх руках будучыню Радзімы.

Яна ВАЛАСАЧ, Лізавета КРУПЯНЬКОВА, Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, Алена ДРАПКО, Вераніка КАНЮТА.

ПАЗНАВАЛЬНА, ЯСКРАВА, ПА-СЯБРОЎСКУ

На «Марафоне адзінства» ў Гродне было цікава і дарослым, і дзецям

Унікальныя выстаўкі, знакавыя сустрэчы са знакамітымі беларусамі, святы на прадпрыемствах, новы мурал, гарадскі квэст, мноства інтэрактыўных пляцовак, канцэрт блогераў і гала-канцэрт «Час выбраў нас». Такой запомніцца тысячам гродзенцаў рэспубліканская грамадска-культурная акцыя, у ходзе якой зроблены важны крок да адзінства нацыі.

«МЫ — НАРОД БЕЛАРУСІ»

Кульмінацыяй марафону ў Гродне стаў гала-канцэрт «Час выбраў нас» з удзелам вялікай колькасці музычных калектываў і салістаў. У зале панавала атмасфера сапраўднай гармоніі гукаў і адзінства.

— За кароткі тэрмін, а марафон стартаваў у верасні мінулага года, ён пабываў у 15 гарадах ва ўсіх рэгіёнах краіны, дэманструючы нашу адзіную культуру, багатую гісторыю і традыцыі — тое, чым мы можам па праве ганарыцца, — сказаў падчас адкрыцця гала-канцэрта **прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА.** — Маштаб акцыі ўражвае. Такая атмасфера пануе і ў гэтым палацы.

Як падкрэсліў кіраўнік урада, «Марафон адзінства» дазволіў яшчэ раз перакананца ў тым, наколькі багатая наша гісторыя, наколькі разнастайная культура. І самае галоўнае, якія працавітыя, разумныя і таленавітыя людзі жывуць у Беларусі. Жыхары Гродна — адлюстраванне гэтай багатай спадчыны. Кожны ўносіць свой уклад у развіццё горада, рэгіёна і краіны.

— Мы разам стварылі моцную незалежную Беларусь. Гэта стала магчымым дзякуючы таму, што аб'ядноўвае нас усіх: наша сіла і агульны лёс. І наша адзінства — гэта не толькі пра мінулае, гэта аб сучаснасці і будучыні, — лічыць прэм'ер-міністр.

ЗМЯСТОЎНА І ШЧЫРА

На традыцыйнай у рамках марафону сустрэчы «Маё жыццё. Мой шлях. Мой Прэзідэнт» у Гродне галоўным спікерам выступіла **Лідзія ЯРМОШЫНА — старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі ў 1996—2021 гадах.**

Лідзія Ярмошына — чалавек, чыё жыццё цесна пераплецена з гісторыяй сучаснай Беларусі. Сваімі думкамі і назіраннямі яна падзялілася са студэнтамі і прадстаўнікамі грамадскасці горада. Яе галоўны рынцып — рабіць тое, што лічыш правільным для сваёй краіны. Гэта і ёсць сапраўдны патрыятызм. На яе думку, моладзь сёння выконвае ключавую ролю ў развіцці краіны, таму ёй важна быць ініцыятыўнай, актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці.



Сярод галоўных дасягненняў незалежнай Беларусі спікер назвала стварэнне ўласнай выбарчай сістэмы, развіццё дэмакратычных традыцый правядзення выбараў і захаванне суверэнітэту ў 2020 годзе. «Мы павінны быць адзіныя, таму што толькі разам зможам будаваць моцную і квітнеючую Беларусь», — адзначыла Лідзія Ярмошына і выказала ўпэўненасць у прадказальнасці сёлетніх выбараў. Кампанія, па яе назіраннях, ідзе спакойна і арганізавана. Выбаршчыкі выказваюць інтарэс да палітычнай падзеі. Таксама падкрэсліла, што ў беларусаў напярэдзе ўсе шанцы для стабільнага развіцця.

КАСМІЧНЫ І КНІЖНЫ АКЦЭНТ

Многім гродзенцам запомнілася сустрэча з **першым беларускім касманаўтам Марынай ВАСІЛЕЎСКАЙ.** Гараджане маглі задаць пытанні як на тэму касмасу, так і асабістага характару. Марына расказала, што з дзяцінства была патрыётам сваёй краіны. Такое ж пачуццё было ў яе і калі траплі ў космас і ўбачыла Зямлю з вышыні 400 кіламетраў. Тады зразумела, наколькі каштоўны мір, як важна яго захаваць.

— Сёння мы ганарова можам называцца касмічнай дзяржавай. І гэта стала магчымым толькі дзякуючы нашаму Прэзідэнту. Мы не будзем спыняцца на дасягнутым, абавязкова працягнем развівацца ў касмічнай сферы, — зазначыла Марына.

Сама яна працягвае гуманітарную місію і з'яўляецца намеснікам старшыні Беларускага фонду міру, які аказвае дапамогу дамам дзіцяці і ветэранам.

У гэты ж дзень у рамках «Марафону адзінства» ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я. Карскага адбыўся праект «Веды без меж», у выніку якога фонды бібліятэчнай сістэмы рэгіёна папоўніліся на 300 экзэмпляраў сацыяльна значнай літаратуры. Таксама бібліятэкі атрымалі сертыфікаты на доступ да рэспубліканскіх электронных рэсурсаў. Прыемную місію ажыццявіў генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін.

ІНТЭРАКТЫЎНЫ КВАРТАЛ

Галоўнай лакацыяй другога дня рэспубліканскай акцыі стала пляцоўка Лядовага палаца дзяржаўнай установы «Хакейны клуб «Нёман». Тут разгарнуўся выставачна-гандлёвы гарадок з цэлым комплексам экспазіцый, фудтракам, сцэнічнай пляцоўкай. Значную частку наведвальнікаў складалі маладыя гродзенцы, якія прыйшлі паўдзельнічаць у квэсце, убачыць ваенную тэхніку, паслухаць музычныя выступленні беларускіх артыстаў і блогераў.

Больш за тысячу ўдзельнікаў і каля сотні каманд сабраў гарадскі квэст «Гэта ўсё маё, роднае», які прайшоў у рамках марафону. Самай папулярнай стала дзясятая станцыя «Бульба Дэнс», дзе ўдзельнікі змаглі паказаць свае танцавальныя навыкі і ад душы павесяліцца.

Цікавасць выклікала і выстаўка ваеннай пагранічнай тэхнікі. На пляцоўцы Лядовага палаца было прадстаўлена звыш 70 унікальных экспанатаў, асноўная частка якіх — сучасныя ўзоры ўзбраення і тэхнічных сродкаў пагранічнага кантролю, а таксама інавацыйныя сродкі аховы граніцы і сувязі. «Фішкай» выстаўкі сталі паказальныя выступленні па рукапашным баі і дэманстрацыя работы кіналагаў.

МУРАЛ У СПАДЧЫНУ

Важным складнікам марафону стаў удзел беларускіх блогераў. Для іх было падрыхтавана некалькі экскурсій на прадпрыемствы, а пад заслону топавыя блогеры выступілі на канцэртнай пляцоўцы Лядовага палаца. Іх вітала каля 15 тысяч гледачоў. Адным з нумароў стаў новы хіт «Я цябе люблю, Радзіма мая!».

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Фота аўтара і з адкрытых крыніц.

РЕЗУЛЬТАТЫ
ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«На своей стороне с Приорбанком»

Сведения об Организаторе рекламной игры: общество с ограниченной ответственностью «Яскрава», УНП 191548102, зарегистрировано 16 ноября 2011 года Минским горисполкомом.

Местонахождение Организатора: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 902.

Наименование рекламной игры: «На своей стороне с Приорбанком».

Рекламная игра зарегистрирована Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь, выдано Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры от 28.08.2024 г. № 4462.

Период проведения рекламной игры: с 01.09.2024 г. по 18.02.2025 г.

Количество участников рекламной игры составило 180 931 человек.

Розыгрыш призов был проведен 18 декабря 2024 г. в 15:00 по адресу: **г. Минск, ул. Ольшевского 22, 902 офис.**

Победители, выигравшие Призы Стороны «День»:

Приз «Кофемашина»: кофемашина DeLonghi Dinamica ECAM350.50.B, стоимостью 2300,00 (две тысячи триста) белорусских рублей 00 копеек + денежные средства в размере 312,60 (триста двенадцать) белорусских рублей 60 копеек: Петринич В. Ю., Непорадная Ю. Н., Латышев Д. А., Панкратов А. С., Цедрик И. А., Руцкая Н. Н., Карпович О. Д., Яцук И. Л., Авдеюк А. Я., Капустина М. М.

Приз «Робот-пылесос»: робот-пылесос Xiaomi Robot Vacuum X10 BHR6068EU / B102GL, стоимостью 1399,00 (одна тысяча девяносто девять) белорусских рублей 00 копеек + денежные средства в размере 177,97 (сто семьдесят семь) белорусских рублей 97 копеек: Маскальчук В. Н., Кушнер Ю. А., Байдала А. О., Баркалина А. М., Гурков В. О., Будрицкий А. В., Щербенок В. Б., Плевако Е. Н., Суббота О. А., Товкач Н. В.

Приз «Телевизор»: телевизор Samsung QE65Q80CAUXRU, стоимостью 5230,00 (пять тысяч двести тридцать) белорусских рублей 00 копеек + денежные средства в размере 750,41 (семьсот пятьдесят) белорусских рублей 41 копейка: Худаяр С. П., Мизина А. А., Орловская Д. Б, Герасимович В. Г., Мирончик А. Л.

Приз «Велосипед»: велосипед Kross Level 5.0 M 29/ KRLV5Z29X17M007179 (M, темно-синий/голубой), стоимостью 3750,00 (три тысячи семьсот пятьдесят) белорусских рублей 00 копеек + денежные средства в размере 529,26 (пятьсот двадцать девять) белорусских рублей 26 копеек: Киселев М. Н., Соколова Е. П., Михайловская Т. О., Гарак С. В., Горбач В. В.

Приз «Сертификат»: Подарочный сертификат на поездку в Дубай (Объединённые Арабские Эмираты) сроком действия до 30.06.2025 г. номиналом 10000,00 (Десять тысяч) белорусских рублей стоимостью 10000,00 (десять тысяч) белорусских рублей 00 копеек + денежные средства в размере 1463,17 (одна тысяча четыреста шестьдесят три) белорусских рубля 17 копеек: Гайдук Т. Ф.

Победители, выигравшие Призы Стороны «Ночь»:

Приз «Умные часы»: умные часы Apple Watch Series 9 GPS 45mm (Midnight, ремешок M/L), стоимостью 1699,00 (одна тысяча шестьсот девяносто девять) белорусских рублей 00 копеек + денежные средства в размере 222,79 (двести двадцать два) белорусских рубля 79 копеек: Багновец Г. М., Живаев А. Ю., Ременьчик Л. Н., Самуйлик А. Н., Талапин М. А., Трус А. О., Шевченко Е. Н., Третьякова Н. Л., Угляница Е. С., Шельманов С. В.

Приз «Приставка»: игровая приставка Sony PlayStation 5 с дисководом Ultra HD Blu-ray / CFI-1218A, стоимостью 2450,00 (две тысячи четыреста пятьдесят) белорусских рублей 00 копеек + денежные средства в размере 335,01 (триста тридцать пять) белорусских рублей 01 копейка: Багрова М. М., Делиу А. К., Роговой А. А., Шебалин С. Г., Шикуло В. И., Шлык Е. З., Щербо С. Н., Юрко А. В., Юрченко В. А., Янович П. А.

Приз «Смартфон»: смартфон Apple iPhone 15 Pro 256GB A3102 / A3101 (черный титан), стоимостью 4699,00 (четыре тысячи шестьсот девяносто девять) белорусских рублей 00 копеек + денежные средства в размере 671,07 (шестьсот семьдесят один) белорусский рубль 07 копеек: Мятликов М. М., Афанасёнок О. В., Куц М. В., Чумакова Е. В., Чередниченко Д. В.

Приз «Ноутбук»: ноутбук Honor MagicBook X 16 Pro 2024 BRN-G56 (5301AHQR), стоимостью 3000,00 (три тысячи) белорусских рублей 00 копеек + денежные средства в размере 417,20 (четыреста семнадцать) белорусских рублей 20 копеек: Гучко Д. С., Рыкун А. Н., Шерстобитова О. Ф., Шмат А. В., Яровой А. С.

Приз «Деньги»: денежный приз на 10 000 BYN, стоимостью 10000,00 (десять тысяч) белорусских рублей 00 копеек + денежные средства в размере 1463,17 (одна тысяча четыреста шестьдесят три) белорусских рубля 17 копеек: Куценко Д. А.

Победитель, выигравший Главный приз – Автомобиль Voyah Free EVR Китай VIN LDP95H963RE303511, 2024 г. в., цвет черный, металлик, стоимостью 121900,00 (сто двадцать одна тысяча девятьсот) белорусских рублей + денежные средства в размере 18183,86 (восемнадцать тысяч сто восемьдесят три) белорусских рубля 86 копеек: Бернат М. К.

Призовой фонд разыгран полностью.

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: **+375(17)3887882.**

Правила рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» № 170 (30304) от 31.08.2024 г.

МОГИЛЕВСКИЙ ФИЛИАЛ РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона)

информирует о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Могилевские семена трав» (Продавец) на праве собственности

Электронные торги состоятся 26.02.2025 г. в 11:00 на электронной торговой площадке GOSTORG.BY

Лот № 1: Автомобиль Audi A8, 1996 г. в., р/з 1036 АЕ-6, инв. № по бух. учету 336, VIN№ WAUZZZ4DZTN002902**. Начальная цена продажи: 21 240.00 бел. рублей с учетом НДС. Сумма задатка: 2 124,00 бел. руб.**

Местоположение Лота №1: г. Могилев, Шкловское шоссе, 27.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, Могилевского облисполкома и на торговой площадке GOSTORG.BY. Организатор торгов и оператор ЭТП**: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**, УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к.352, Mogilev@ino.by. Доп. информацию можно получить по тел**: +375(222)72-41-14, +375(29)624-26-25,** на сайте ЭТП **www.gostorg.by**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белинвестбанк» (Продавец) на праве собственности.

Электронные торги состоятся 21 февраля 2025 г.

Лот № 1: Пилорама для древесины TYP SAM 2006, заводской № 0484/2020.

Год выпуска: 2020. Начальная цена с НДС 20 % – 3 120,00 руб. Задаток – 312,00 руб.

Лот № 2: Дробилка – измельчитель древесины Rebak/Zefam.

Начальная цена с НДС 20 % – 34 560,00 руб. Задаток – 3 456,00 руб.

Адрес Лотов № 1-2: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Фабрициуса, 8В

Шаг электронных торгов – 5 %.

Срок для заключения договора купли-продажи: не позднее 7 (семи) рабочих дней со дня проведения электронных торгов (после предъявления Продавцу копии платежного документа, подтверждающего оплату вознаграждения и затрат на организацию и проведение электронных торгов Организатору электронных торгов).

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 18 февраля 2025 г. в 16.00.

Организатор электронных торгов:
8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,
torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Ч.002.00019** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

Продавец: открытое акционерное общество «ВИСТАН», 210627, г. Витебск, ул. Димитрова, 36/7, тел. 8 (0212) 608605.

Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

Дата и время проведения торгов: 06.02.2025 г. в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 200/С-107466, площадью 691,9 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/13, наименование – компрессорная с пристройкой, назначение – здание специализированное иного назначения. Составные части и принадлежности: пристройка.

Нач.цена: 114 600,00 бел.руб. с учетом НДС. Задаток: 11 460,00 бел. руб.

Объект находится на земельном участке с кадастровым № 240100000002000413, площадью 11,1036 га, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36 (общая долевая аренда).

Лот № 2. Изолированное помещение с инв. № 200/D-190909, площадью 1800,6 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23-5, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение.

Нач. цена: 534 720,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток: 53 472,00 бел. руб.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» etpvit.by. **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 05.02.2025 г. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия электронных торгов**: победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для проведения аукциона, и расходы Продавца на проведение независимой оценки; заключить договор купли-продажи предмета аукциона в течение 15 рабочих дней с даты проведения аукциона, оплатить предмет аукциона в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. *Расходы Продавца на проведение независимой оценки по лоту № 1 – 270,00 бел. руб. с НДС., по лоту № 2 – 270,00 бел. руб. с учетом НДС.*

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее, чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Шевеленко Галина Владимировна +375(25)5155676

В суд Речицкого района Гомельской области поступило заявление о признании безвестно отсутствующей Твардовской (Филатовой) Елены Александровны, 10.04.1987 года рождения, последние известные адреса проживания: 1) Гомельская область, Речицкий район, д. Антополь, д. 13; 2)Гомельская область, Речицкий район, д. Антополь, ул. Речная, д. 54; 3) г. Речица, ул. Мичурина, д. 68.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Речицкого района в течение 2-х месяцев со дня публикации имеющиеся сведения о Твардовской (Филатовой) Елене Александровне.

ИЗВЕЩЕНИЕ о наличии оснований для признания жилого дома пустующим

Задорьевский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Логойского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: Минская область, Логойский район, д. Красное, дом номер 10, имеющий основания для признания его пустующим.

Сведения о жилом доме (из акта):

Наружные размеры одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме): 6,0 х 10,9 м.

Площадь: _____ 65 м кв. _____ (заполняется при наличии сведений о ней)

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме) _ отсутствуют сведения _____
(заполняется при наличии таких сведений)

Материал стен: дерево

Этажность: одноэтажный

Подземная этажность: _____отсутствует_____ (заполняется при наличии таких сведений)

— Летась у раёне на развіццё эканомікі і сацыяльнай сферы было выкарыстана болей чым 160 мільёнаў рублёў — у два разы болей, чым пазалетась. Асноўная частка інвестыцый накіравана на набыццё машын і абсталявання. У раёне вядзецца рэалізацыя інвестпраекта з удзелам кітайскага капіталу па будаўніцтве майнінгавых ферм — гэта першы падобнага роду праект у вобласці. Магутнасці іх будуць выкарыстоўвацца для здабычы лічбавых манет. У якасці ініцыятывы «Адзін раён — адзін праект» крычаўскае ТАА «КМБ-Усход» мадэрнізуе шыферную вытворчасць і пашырае лінейку тавараў. Тут будзе наладжаны выпуск фібрацэментных дахавых матэрыялаў і вытворчасць панэляў для фасадаў і ўнутранага аздаблення памяшканняў.

У раёне таксама арганізавана новая вытворчасць біяматаў, якія прадугледжваюць абарону глебы ад эрозіі і служаць для ўтварэння ўстойлівага расліннага покрыва. Арганізацыя вытворчасці плануецца з выкарыстаннем трох тэхналагічных ліній, першая з якіх ужо працуе. Створана 27 новых працоўных месцаў. Прадукцыя карыстаецца попытам у Расіі.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
г. Крычаў.

Фота з сайта Крычаўскага райвыканкама.

ШАНУЙ СВАЁ!

ДОБРАЯ РЭКЛАМА ПРЫДНЯПРОЎСКАГА КРАЮ

У Магілёве падвялі вынікі рэаліці-шоу «Фабрыка блогераў»

Горад на Дняпры стаў месцам унікальнага мерапрыемства ў свеце айчыннага медыякантэнту. Яго арганізатары — Магілёўскі аблвыканкам і ГАА «Фестывалі бай». Мэта, якую ставілі перад сабой стваральнікі шоу, — паказаць дасягненні Беларусі ў розных сферах дзейнасці, прарэкламаваць айчынныя брэнды, актывізаваць блогерскі рух Беларусі. У якасці галоўнага прыза прапаноўвалася грашовая прэмія ў памеры 20 тысяч рублёў.

Ментарамі праекта выступілі Вольга Бузава, Улад Кабякоў, Яўген Анегін і іншыя вядомыя блогеры. Старт быў дадзены 1 снежня мінулага года. З болей чым 100 перспектыўных кандыдатаў былі адабраныя 15 блогераў, у тым ліку, з Магілёва, Мінска, Гродна, Віцебска і... Масквы. Усе яны зоркі TikToka. Увесь перадназагодні тыдзень шчасліўчыкі жылі ў «блогерскім доме», праходзілі майстар-класы, атрымлівалі заданні, у тым ліку па прасоўванні беларускіх прадпрыемстваў. За тым, як гэта адбывалася, можна было сачыць у сацыяльных сетках, а таксама на старонках або ў эфіры мас-медыя.

Напярэдадні Дня ратавальніка Беларусі, 18 студзеня, у Магілёве адбылося грандыёзнае шоу з удзелам вядомых артыстаў і блогераў. Мерапрыемства сабрала на плошчы Адзінства болей чым 40 тысяч чалавек. У якасці ганаровых гасцей прысутнічалі прадстаўнікі мясцовай улады, дэпутаты, парламентарыі. Перад публікай выступілі Аляксандр Саладуха, Дзмітрый Азаранка, PAVA, кавер-бэнд «Еноты», ансамбль «Весялуха», група «Dabro» і іншыя.

А пераможцай першага ў Беларусі рэаліці-шоу і ўладальніцай галоўнага прыза — 20 тысячы рублёў — стала каларытная «баба Нюра» — мінчанка Ганна Клінцэвіч. Маладая жанчына некалькі гадоў таму пачала запісваць ролікі ў TikToky ад імя «бабы Нюры» і хутка набыла вялікую папулярнасць. Гледачоў скарыў створаны Ганнай збіральны персанаж жыхаркі вёскі, дзе, як яна прызналася, сама ў дзяцінстве з задавальненнем праводзіла шмат часу.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА адзначыў, што сёння інтэрнэт-прастора мае вялікае ўздзеянне на чалавека. Таму разам з блогерамі кіраўніцтва вобласці паклапацілася паказаць як мага паўней прыгажосць Прыдняпроўскага краю, яго жыхароў, прамысловасць. Па меркаванні кіраўніка вобласці, усё атрымалася.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

БАЧЫЦЬ СВЕТ ПРАЗ МУЗЫКУ

дапамагаюць невідушчаму гамяльчаніну нераўнадушныя людзі

Ёсць людзі — дэльфіны. Становішча аб'екта ці прадмета вызначаюць па часе затрымкі адлюстраванай гукавой хвалі і «бачаць» пры дапамозе гуку. Так «гучанне» жыцця счытваюць людзі невідушчыя. Гамяльчанін Дзмітрый ГЕРАШЧАНКА якраз з такіх. Але ён не проста выкарыстоўвае свой высокаразвіты слых, каб арыентавацца ў моры жыццёвым, а дапамагае іншым пачуць музыку самых розных прадметаў.

Дзмітрый Герашчанка — татальна невідушчы музыкант-мультыінструменталіст. Ён валодае больш як дзесяццю музычнымі інструментамі. Яму пашчасціла прафесійна рэалізавацца ў Гомельскім абласным цэнтры інклюзіўнай культуры. Па выніках 2023 года калектыў установы стаў лаўрэатам прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». Асаблівасць гомельскага цэнтра ў тым, што ён адзіны ў краіне, дзе людзі з рознымі катэгорыямі інваліднасці займаюцца разам з фізічна здаровымі. Яны развіваюць самыя розныя праекты па сацыяльнай, псіхалагічнай, творчай адаптацыі.

Старанямі Дзмітрыя Герашчанкі, напрыклад, у цэнтры дзейнічае музычная лабараторыя. У ёй Дзмітрый — не толькі таленавіты музыкант, але і музычных спраў майстар: аднаўляе старажытныя народныя музычныя інструменты. Папулярызуе яшчэ адзін творчы кірунак — стварэнне аўтэнтычных народных інструментаў з выкарыстаннем разнастайных прадметаў. Паслухаць іх гучанне можна на выступленнях калектыву «MIROWAY» пад кіраўніцтвам Дзмітрыя.

Акрамя таго, жыццёвы вопыт чалавека з інваліднасцю, уласны досвед бацькоўства сёння дапамагаюць Дзмітрыю Герашчанку рэалізавацца і як педагогу. Ён — кіраўнік музычнай студыі «Ла-ла-лэнд» Гомельскага абласнога цэнтра інклюзіўнай культуры. Далучае да свету гукаў дзяцей з асаблівасцямі развіцця, займаецца з малымі з расстройствам аўтычнага спектра.

— Хочацца прыносіць людзям больш карысці. Бо што найважнейшае ў жыцці? — тлумачыць сваю пазіцыю Дзмітрый. — У свеце шмат відушчых, здаровых людзей, якія баяцца жыць. Мы можам вучыцца радавацца жыццю разам!

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота з архіва герояў.

ИЗВЕЩЕНИЕ о наличии оснований для признания жилого дома пустующим

Задорьевский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Логойского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: Минская область, Логойский район, д. Хатень, дом без номера, имеющий основания для признания его пустующим.

Сведения о жилом доме (из акта):

Наружные размеры одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме): 5,9 х 11,1 м.

Площадь: _____65 м кв. _____

(заполняется при наличии сведений о ней)

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме): _ отсутствуют сведения _____

(заполняется при наличии таких сведений)

Материал стен: дерево

Этажность: одноэтажный

Подземная этажность: ____отсутствует_____

(заполняется при наличии таких сведений)

Принадлежности одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме) (хозяйственные и иные постройки)

Сарай	**6,4 х 6,8 (наружные размеры)**

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный, блокированный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: Карпович А. А., Карпович Е. А., Карпович Н. А.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном, блокированном жилом доме (квартире в блокированном жилом доме) собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом (квартирой): более 20 лет

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Задорьевский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Задорьевский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить о намерении использовать пустующий дом для проживания. Наш адрес: 223145, аг. Задорье, ул. Центральная, 5, Логойский район, Минская область. Электронный адрес: zadorye@logoysk.gov.by.

Телефоны для справок: 80177475335, 75383. УНП 600181628

ИЗВЕЩЕНИЕ о наличии оснований для признания жилого дома пустующим

Задорьевский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Логойского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: Минская область, Логойский район, д. Засовье, ул.Центральная, дом № 54, имеющий основания для признания его пустующим.

Сведения о жилом доме (из акта):

Наружные размеры одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме): 4,8 х 12,8 м.

Площадь: _____62 м кв. _____

(заполняется при наличии сведений о ней)

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме): _____ отсутствуют сведения _____

(заполняется при наличии таких сведений)

Материал стен: дерево

Этажность: одноэтажный

Подземная этажность:_____отсутствует_____

(заполняется при наличии таких сведений)

Принадлежности одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме) (хозяйственные и иные постройки)

Сарай с пристройкой	**нет** (наружные размеры)

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный, блокированный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: Шайтар Т.В.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном, блокированном жилом доме (квартире в блокированном жилом доме) собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом (квартирой): более 3-х лет. От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Задорьевский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Задорьевский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить о намерении использовать пустующий дом для проживания. Наш адрес: 223145, аг. Задорье, ул. Центральная, 5, Логойский район, Минская область. Электронный адрес: zadorye@logoysk.gov.by. Телефоны для справок: 80177475335, 75383. УНП 600181628

ИЗВЕЩЕНИЕ о наличии оснований для признания жилого дома пустующим

Задорьевский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Логойского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: Минская область, Логойский район, д. Хатень, дом без номера, имеющий основания для признания его пустующим.

Сведения о жилом доме (из акта):

Наружные размеры одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме): 5,5 х 9,5 м.

Площадь: _____52 м кв. _____

(заполняется при наличии сведений о ней)

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме): _____ отсутствуют сведения _____

(заполняется при наличии таких сведений)

Материал стен: дерево

Этажность: одноэтажный

Подземная этажность: _____отсутствует_____

(заполняется при наличии таких сведений)

Принадлежности одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме) (хозяйственные и иные постройки): нет.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный, блокированный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: Танкевич Е.Л.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном, блокированном жилом доме (квартире в блокированном жилом доме) собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом (квартирой): более 3-х лет

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Задорьевский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Задорьевский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить о намерении использовать пустующий дом для проживания. Наш адрес: 223145, аг. Задорье , ул. Центральная, 5, Логойский район, Минская область.

Электронный адрес: zadorye@logoysk.gov.by. Телефоны для справок: 80177475335, 75383. УНП 600181628

ИЗВЕЩЕНИЕ о наличии оснований для признания жилого дома пустующим

Задорьевский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Логойского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: Минская область, Логойский район, д. Хорошее, ул. Подлесная, дом № 8, имеющий основания для признания его пустующим.

Сведения о жилом доме (из акта):

Наружные размеры одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме): 5,2 х 5,3 м.

Площадь% _____ 28 м кв. _____

(заполняется при наличии сведений о ней)

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме): _ отсутствуют сведения _____

(заполняется при наличии таких сведений)

Материал стен: дерево

Этажность: одноэтажный

Подземная этажность: _____отсутствует_____

(заполняется при наличии таких сведений)

Принадлежности одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме) (хозяйственные и иные постройки)

Сарай с пристройкой	**5,5 х 2,8, 3,8 х 4,8** (наружные размеры)
Навес	**1,9 х 7,5**

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный, блокированный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: Гунько Я. И., Гунько В. П., Елисеева А. П.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном, блокированном жилом доме (квартире в блокированном жилом доме) собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом (квартирой): более 3-х лет

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Задорьевский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Задорьевский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить о намерении использовать пустующий дом для проживания. Наш адрес: 223145, аг. Задорье , ул. Центральная, 5, Логойский район, Минская область. Электронный адрес: zadorye@logoysk.gov.by. Телефоны для справок: 80177475335, 75383. УНП 600181628

ИЗВЕЩЕНИЕ о наличии оснований для признания жилого дома пустующим

Задорьевский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Логойского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: Минская область, Логойский район, д. Хатень, дом без номера, имеющий основания для признания его пустующим.

Сведения о жилом доме (из акта):

Наружные размеры одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме): 5,9 х 10,5 м.

Площадь: _____62 м кв. _____

(заполняется при наличии сведений о ней)

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме): _ отсутствуют сведения _____

(заполняется при наличии таких сведений)

Материал стен: дерево

Этажность: одноэтажный

Подземная этажность: _____отсутствует_____

(заполняется при наличии таких сведений)

Принадлежности одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме) (хозяйственные и иные постройки): нет.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный, блокированный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: Танкевич Е.М., Танкевич Н.И.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном, блокированном жилом доме (квартире в блокированном жилом доме) собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом (квартирой): более 20 лет

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Задорьевский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Задорьевский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить о намерении использовать пустующий дом для проживания. Наш адрес: 223145, аг. Задорье , ул. Центральная, 5, Логойский район, Минская область. Электронный адрес: zadorye@logoysk.gov.by. Телефоны для справок: 80177475335, 75383. УНП 600181628

ИЗВЕЩЕНИЕ о наличии оснований для признания жилого дома пустующим

Задорьевский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Логойского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: Минская область, Логойский район, д.Хатень, дом № 14, имеющий основания для признания его пустующим.

Сведения о жилом доме (из акта):

Наружные размеры одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме): 5,4х 10,6 м.

Площадь: _____57 м кв. _____

(заполняется при наличии сведений о ней)

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме): _ отсутствуют сведения _____

(заполняется при наличии таких сведений)

Материал стен: дерево

Этажность: одноэтажный

Подземная этажность: _____отсутствует_____

(заполняется при наличии таких сведений)

Принадлежности одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме) (хозяйственные и иные постройки): нет.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный, блокированный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: **Карпович О. Ф., Дубовская И. В., Бахар С. В.**

Предположительный срок непроживания в одноквартирном, блокированном жилом доме (квартире в блокированном жилом доме) собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом (квартирой): более 20 лет

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Задорьевский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Задорьевский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить о намерении использовать пустующий дом для проживания. Наш адрес: 223145, аг. Задорье , ул. Центральная, 5, Логойский район, Минская область. Электронный адрес: zadorye@logoysk.gov.by. Телефоны для справок: 80177475335, 75383. УНП 600181628

НЯСУМНАЕ ЧЫТАННЕ

«І БЫЎ ПАРАДАК, ЛАД У ХАЦЕ...»

Што пісалі беларускія класікі пра добраўпарадкаванне

«Над гарадом і садам — сонца. Віецца матавы гарох, пахне кропам і канюплямі, матылямі чырванее на градах мак, гудуць, вылятаючы з вупляў, пчолы. Лапушацца вялізныя, на чырвона-зялёных ножках-сцяблінках, лісты рэвеню, «беларускага апельсіна». А ўначы, калі ляжыш на посцілцы пад дрэвам, часам чуеш, як глуха, нібы гіры, падаюць на дах антонаўкі і бубняць, ракочуць, скочваючыся па ім», — так узнёсла апісваў Уладзімір Караткевіч у эсэ «Зямля пад белымі крыламі» беларускую гасподу... Недарэмна гэты год абвешчаны Годам добраўпарадкавання — беларусы нават у часы нястачы імкнуліся да чысціні і прыгажосці. Цудоўную выцінанку на шыбу прыладзіць, кашулю вышыўкай аздобіць... Парадкавалі свой побыт і героі беларускай літаратурнай класікі.

«Гумно паўнела з кожным годам»

«Лад у хаце» — гэтыя словы часта сустракаюцца ў паэме Якуба Коласа «Новая зямля». Героі, чые прататыпы — сам паэт у дзяцінстве і яго сям'я, у кожным куточку, куды закідвае лёс, парадкуюць гаспадарку. Аўтар ва ўсіх падрабязнасцях апісвае побыт вясковых беларусаў — працалюбных, старанных, гаспадарлівых:

«Гумно паўнела з кожным годам,
І багацеў хлявец прыплодам,
І грош стаў лішні завадзіцца,
Было што есці, чым акрыцца,
І быў парадак, лад у хаце...
А цэлы рад збаноў на плоце
Казаў аб тым, што гаспадыня
Была ўжо ў моцнай каляіне
І што яе таксама справа
Вялася добра і рухава».

«Дачка прымусы папраўляе, а сын панчохі цыруе»

Выдатны прыклад працоўнага выхавання — аповесць Янкі Маўра «ТВТ». Пяцікласнікі вучацца перадольваць звычайныя побытавыя здарэнні: зламалася крэсла, працякае дах, адарваўся гузік... Няўжо абавязкова чакаць, пакуль хтосьці направіць? Не дадзім рэчам уладарыць над сабою! І вось Стась прышывае вешалку да свайго паліто, Клава Макейчык ўзяла ды змазала дзверы, каб не рыпалі — «І адразу ў іх доме зрабілася так ціха, лагодна, нібы яны перасяліліся на другую кватэру». *«Вельмі ўсцешыў і здзівіў бацькоў Толя Бяспалаў. У шуфлядах камоды даўно ўжо былі адарваны ручкі, і, каб адчыніць іх, патрабаваліся складанейшыя аперацыі... Можна цяпер уявіць сабе радасць сям'і, калі раптам у камоды з'явіліся ручкі, ды яшчэ якія: Паўлік узяў ды прымацаваў звычайныя электратэхнічныя ролікі». Больш за тое — дзяўчынкі браліся за паяльнік і малаток, а хлопцы — за іголкі і ніткі. «Бацькі зусім збіліся з панталыку. Што ж гэта робіцца ў іх доме? Дачка прымусы папраўляе, а сын панчохі цыруе! Увесь свет прайдзі, такога не ўбачыш.*

Загаманіў і свет, у які ўваходзілі тры суседнія двары, і падзяліўся на дзве часткі.

— Вось гэта я разумею! — казалі ў адной частцы свету. — Цяперашняя моладзь не будзе такой бездапаможнай, як мы. Усё сама зробіць.

А ў другой частцы свету чуліся інакшыя галасы:

— Ну, калі мужчыны пачнуць панчохі цыраваць ды кашулі латаць, а жанчыны прымусы ды боты папраўляць, — тады парадку не будзе. Спрадвеку кожны займаўся сваёю справай.

Трэба толькі адзначыць, што ў гэтай другой частцы свету налічвалася вельмі мала народу».

Янка Маўр, знаўца дзіцячай псіхалогіі, здолеў незвычайнае: нецікавыя побытавыя справы ахутаў рамантыкай, ператварыў ледзь не ў подзвіг, які можа ўчыняць штодня. Пакаленнямі дзеці вучыліся добраўпарадкаванню па яго кнізе.

«Арлы на свет вылятаюць з такіх менавіта гнёзд»

Адзін з ранніх вершаў Уладзіміра Караткевіча, напісаны ў 1957 годзе, апісвае ўмоўны беларускі дом, які сімвалізуе ўсю Беларусь. І ў гэтым доме павінны быць мір і лад:

«Мір гэтаму дому,
Дзе шчасце мы бачылі ўсе...
...Прытульны, добры і цёплы
Наш беларускі свет.
Садок да рачулкі збягае,
Хатка глядзіцца ў плёс.
. . . . . .
Арлы на свет вылятаюць
З такіх менавіта гнёзд».

«Вокны ягоныя небам зашклёны»

Аркадзю Куляшову давялося пакідаць Мінск пад нямецкімі бамбёжкамі. Працаваў у франтавых газетах, што мог, аддаваў дзеля Перамогі... Бачыў зруйнаваны акупантамі горад... А потым назіраў, як ён аднаўляецца, як беларускі народ здзяйсняе свой працоўны подзвіг. У 1946 годзе Куляшоў напісаў пра гэта верш «Дом»:

«Плотам драўляным яго на світанні
Абнеслі,
На рыштаванні
Пачуліся першыя песні.
Хай яшчэ вокны ягоныя
Небам зашклёны,
А ўжо здаецца,
Што выгляд змяніўся ягоны.
Гэткім зрабіўся ён, што нават хмарка
І тая
Стала над домам
І далей плысці не жадае.
Стала над ім нерухома,
А людзям здаецца,
Што гэта з коміна, з дома
Дым першы віецца».

«Павесіце на месца скінутыя лейцы»

У творах паэта Янкі Сіпакова, які з пакалення дзяцей вайны, жыве гістарычная памяць. Верш «Лягчэй вы паміралі, нашы прашчуры...» — пра повязь пакаленняў і пераемнасць традыцый. Паэт уяўляе, як увесну і ўвосень прашчуры наведваюць дамы, дзе жывуць іх нашчадкі:

«Перш чым зайсці у сцішаную хату,
Усё агледзіце руплівым вокам,
За кожны знадабень зачэпіцеся вы:
Вясной — у баране папраўце кляцы,
Падмажаце рыпучыя калёсы,
Павесіце на месца скінутыя лейцы
І ў думках свайго сына паўшчуваеце,
Што гаспадарыць ён не так, як вы.
А восенню ў вас іншы клопат —
Прыкінуць намалочанае збожжа,
Зірнуць, ці добра выкапана бульба,
Аўса насыпаць коням поўны жолаб
І ўзважыць добра ўлежанае сена —
Ці хопіць на зіму? А потым
Вы прыйдзеце ў цяплынь начную хаты
І сядзеце у покуце на лаву...
А потым, зноў збіраючыся з хаты,
Вы пакалышаце ліповую калыску,
Дзе ваш унук, прачнуўшыся, заплача».

«Шкрабла нажом стол, лавы, мыла ўсё»

Іван Мележ у «Людзях на балоце» апісваў родную вёску, і апісваў праўдзіва: ёсць і рупныя гаспадары, ёсць і лянівыя ды нядбайныя... Але працавітых усё-ткі больш — уменне трымаць у парадку сваю хату і сваю зямлю шануецца ў народзе спрадвеку. Вядома, вёска ў палескай глыбінцы бедная — чырвонаармеец Міканор, вярнуўшыся дадому, лепей за ўсіх бачыць недахопы: і хаты б святлейшымі ды чысцейшымі зрабіць, лазню б збудаваць... Але вось яго сям'я рыхтуецца да калядняй вячэры: *«Увесь дзень перад «святым вечарам» маці шкрабла нажом стол, лавы, мыла ўсё. Ад ранку ледзь не да самага вечара не тух у печы агонь, варыла, варыла, пякла. Вячэра муселa быць посная, але ж трэба было згатаваць ні мала ні многа: дванаццаць страў!.. З пашанай і нейкай урачыстасцю сачыў бацька, як матка слала на вымытым стале сена, як накрывала яго чыстым настольнікам, як клала бохан хлеба, нож, лыжкі, ставіла конаўку з соллю. Памыўшы ў кутку над цэбрам рукі, ён, белы, у лапцях, у зрэбных штанах, у доўгай, да кален, сарочцы, падпразанай святочным паяском, пачакаў, калі падыдзе маці, і, не глянуўшы на Міканора, першы момант няёмка, стаў голасна маліцца».*

Мележу не ўдалося дапісаць сваю «Палескую хроніку» — але чытачы ўсяго свету дасюль з задавальненнем сочаць, як яе героі змагаюцца за дабрабыт, адбіраюць у балатоў будучыя палеткі, як іх працавітасць дае плён.

Усё пачынаецца з дробных спраў, з уласнай кватэры, уласнага падворка. Гэтаму вучаць і класікі.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ОАО «Н Холдинг» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «МПОВТ»

Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведении аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей

ЛОТ №1	Капитальное строение с инв.500/С-25974, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кульман,16/ 1. Площадь – 1350 кв.м., наименование – здание кафе (лит. В 2/к), назначение – здание специализированное для общественного питания, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 500000000008006969, площадью 0.1982 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве аренды (срок действия: по 30.06.2028 г.). Объект недвижимости обременен правом аренды. На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): охранные зоны линий электропередач, площадь 0.0107 га, охранные зоны сетей и сооружений канализации, площадь 0.0245 га.				
Начальная цена (стоимость) (в т.ч. НДС 20%), BYN	**3 579 286,32**	**Задаток, BYN**	**357 928,63**	**Шаг аукциона**	5%
Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны	ОАО «МПОВТ», Республика Беларусь, 220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62 Тел.: +375 (17) 388 90 99 Email: mpovt@mpovt.by				
Сведения об организаторе аукциона	ОАО «Н Холдинг», 220029, г. Минск, пр. Машерова, 11, пом. 1. Тел.: 8(044) 580 63 02 (Александра)				
Срок подписания договора купли-продажи	Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона.				

Возмещение затрат на организацию и проведение аукционов	Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившиеся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона, обязаны возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1% от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона.
Условия оплаты	Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (не резидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 (BYN) в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр. Независимости, д.56. Получатель – открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.
Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе	Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 19 февраля 2025 года (включительно)** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул.Куйбышева, д.35
Место, дата и время проведения аукциона	Открытый аукцион состоится **21 февраля 2025 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул.Куйбышева, д.35, зал совещаний ОАО «Н Холдинг»
Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее, чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения	

ИНФОРМАЦИЯ
о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (Организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова 5, каб. 321, тел. 8(017) 516 80 64), по поручению **государственного учреждения «Стародорожский территориальный центр социального обслуживания населения»** (222 932, Минская область, г. Старые Дороги ул. Кирова, 95), проводит открытый аукцион по продаже

автомобиля легкового специального, вагон VOLKSWAGEN TRANSPORTER,

2002 г. в., регистрационный знак 8046 ВТ-5 (транз. номер 5 НЕТ 8772), кузов (VIN) WV2ZZZ70Z3X052659, цвет белый, инвентарный номер 01510036, находящегося по адресу: Минская область, г. Старые Дороги, ул. Кирова, 95.

Начальная цена (без НДС) – **9 300,00** бел. руб. (задаток 10% от начальной цены – **930,00** бел. руб.).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Электронные торги состоятся **21.02.2025 г.** в **10.00**. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.02.2025 г.** до **17.00. Тел: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11.**

Тел для осмотра транспорта +375(29) 672 42 89, время осмотра с 9.00 до 16.00, понедельник – пятница.

УНП 690302154

СПОРТ-ТАЙМ

СТАЛІ ВЯДОМЫЯ ІМЁНЫ ЛЕПШЫХ БАРЦОЎ КРАІНЫ

У традыцыйным аглядзе «Звязды» расказваем добрыя спартыўныя навіны

ТУРНІР ТЫДНЯ. Чацвёрты этап Кубка Садружнасці па біятлоне прайшоў у горадзе Дзяміна Ярослаўскай вобласці. Мужчынскую гонку з масавым стартам выйграў беларус Мікіта Лабастаў — у цяперашнім сезоне гэта яго першая перамога ў асабістых гонках. Антон Смольскі заняў першае месца ў гонцы праследавання. Гэта чацвёртая перамога Смольскага ў цяперашнім розыгрышы Кубка Садружнасці і першая ў зімовай частцы спаборніцтваў. Лідар агульнага заліку Кубка Садружнасці на чацвёртым этапе заняў другое месца ў спрынце. Дзмітрый Лазоўскі ў гэтым відзе праграмы заняў трэцяе месца. Ганна Сола стала трэцяй па выніках жаночай гонкі праследавання на 10 кіламетраў. Таксама ў Дзяміна яна стала трэцяй па выніках спрынту.



Фота БелТА.

ПАДЗЕЯ ТЫДНЯ. Чэмпіянат Беларусі па вольнай барацьбе прайшоў у Мінску. Найлепшых вольнікаў сезона вызначалі ў дзесяці вагавых катэгорыях. Сем залатых медалёў выйгралі прадстаўнікі Гродзенскай вобласці: Дзімчык Батамункуеў (да 57 кг), Арыян Цютрын (да 61 кг), Георгій Каліеў (да 70 кг), Мікіта Дзмітрыеў (да 74 кг), Магамедхабіб Кадзімагамедаў (86 кг), Яраслаў Ядкоўскі (да 92 кг) і Аляксандр Гуштын (да 97 кг). Сярод пераможцаў і спартсмены Мінскай вобласці: Аляксандр Вярбіцкі (да 79 кг) і Дзяніс Храмянкоў (да 125 кг), яшчэ адну ўзнагароду вышэйшай пробы заваяваў Іслам Гусейнаў (да 65 кг) з Мінска.

У дзесяці вагавых катэгорыях найлепшых вызначалі і прадстаўнікі грэка-рымскай барацьбы. Чэмпіёнамі краіны сталі пяць прадстаўнікоў Мінскай вобласці: Аляксандр Лявончык (да 72 кг), Ілья Валеўскі (да 77 кг), Ігар Ярашэвіч (да 87 кг), Павел Глінчук (да 130 кг) і Кірыл Маскевіч (да 97 кг). Тры перамогі ў актыве «класікаў» з Гомельскай вобласці — чэмпіёнамі краіны сталі Дзмітрый Кабанок (да 60 кг), Глеб Макаранка (да 67 кг) і Ілья Біцееў (да 82 кг). Таксама пераможцамі нацыянальнага першынства сталі Яраслаў Кардаш (да 63 кг) і Аляксандр Гур'еў (да 55 кг) з Гродзенскай вобласці.

ГЕРАІНЯ ТЫДНЯ. Беларуская спартсменка Ганна Церах стала пераможцай чэмпіянату і Кубка Расіі па веласпорце на трэку. Яна заваявала залаты медаль у гонцы па ачках чэмпіянату Расіі. На Кубку Расіі Ганна выйграла індывідуальную гонку праследавання, устанавіўшы новы рэкорд Беларусі (3 хв. 25,326 сек.). У гэтым жа відзе праграмы на ўсерасійскіх спаборніцтвах сярод юніёраў перамогу атрымаў наш Мікіта Бабовіч.

ПЕРАМОГІ ТЫДНЯ. У Мінску вызначыліся пераможцы і прызёры адкрытага чэмпіянату Беларусі па тэнісе. У мужчынскім адзіночным разрадзе чэмпіёнам краіны стаў 20-гадовы Эрык Аруцюнян. Разам з Данііламі Астапенкавым ён выйграў спаборніцтвы ў парным разрадзе, а выступленне ў тандэме з Эвелінай Ласкевіч прынесла яму перамогу і ў турніры змешаных пар. У жаночым адзіночным разрадзе найлепшай была Ганна Кубарава.

КАМАНДА ТЫДНЯ. Хакеісты мінскага «Дынама» згулялі ўсе матчы пятага тура чэмпіянату Кантынентальнай хакейнай лігі ў фармаце «3 на 3». У пятым туры мінчане правялі шэсць матчаў і атрымалі дзве перамогі — абедзве над «Барысам» з Астаны (3:2 і 4:1). Мінчане, разам з тым, па два разы прайгралі магнітагорскаму «Металургу» (2:6, 3:5) і казанскаму «Ак Барсу» (3:4, 5:6). Пасля 18 гульняў чэмпіянату сталічны клуб з 26 баламі займае другое месца ў сваім дывізіёне, адстаючы ад «Ак Барса» на 7 ачкоў. Наступныя матчы ў чэмпіянаце КХЛ 3х3 з удзелам мінскіх дынамаўцаў адбудуцца з 30 студзеня да 2 лютага.

Валерыя СЦЯЦКО.

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

21 СТУДЗЕНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

1818 год — нарадзіўся Адам Кіркор, беларускі этнограф, гісторык, археолаг, публіцыст, выдавец, член-карэспандэнт Імператарскага археалагічнага таварыства, член Рускага геаграфічнага таварыства. Праводзіў археалагічныя, этнаграфічныя, краязнаўчыя даследаванні ў Віленскай і Мінскай губернях. Вывучыў больш за 1 тысячу курганоў.

1920 год — нарадзіўся (в. Юрэвічы Калінкавіцкага раёна) Уладзімір Фёдаравіч Міцкевіч, партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі. З 1939 года — у Чырвонай Арміі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1955-га — старшыня Мінскага аблвыканкама, з 1962 года — першы сакратар Гродзенскага абкама КПБ, пасля — сакратар ЦК КПБ, першы намеснік старшыні Савета Міністраў БССР.

1939 год — згодна з урадавай пастановай Савета народных камісараў БССР у Мінску ствараласа Дзяржаўная мастацкая галерэя. Яна размясцілася ў пятнаццаці залах будынка Вышэйшай камуністычнай сельскагаспадарчай школы. Асновай мастацкай калекцыі галерэі сталі творы з аддзелаў выяўленчага мастацтва гістарычных музеяў Мінска, Віцебска, Магілёва і Гомеля.

У свеце

1775 год — у Маскве на Балотнай плошчы пакараны смерцю кіраўнік Сялянскай вайны 1773—1775 гадоў Емяльян Пугачоў.

1855 год — нарадзіўся Джон Браўнінг, амерыканскі вынаходнік, канструктар агнястрэльнай зброі. Пісталет Браўнінга М1911 да гэтага часу з'яўляецца адным з самых вядомых і папулярных устройстваў асабістага карыстання для цывільных асоб, а таксама паліцыі і арміі ЗША.

1885 год — нарадзіўся Умберта Нобіле, італьянскі канструктар дырыжабляў і палярны даследчык.

НАДВОР'Е

З МІНУСА Ў ПЛЮС

А ў нядзелю — да 8 цяпла

Студзень нас не песціць зімовым надвор'ем, якое цяпер больш нагадвае познюю восень. У нашай краіне ўтрымліваецца тэмпературны фон на 5—8 градусаў вышэй за кліматычную норму. Гэты працоўны тыдзень не стане выключэннем, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У аўторак чакаецца пераважна воблачнае надвор'я. Месцамі па краіне пройдуць невялікія ападкі, у асноўным у выглядзе дажджу. Месцамі — слабы галалёд. Вецер паўднёвы, паўднёва-ўсходні ад слабога да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 4 да плюс 1 °С, а максімальная днём складзе ад мінус 1 да плюс 4 °С. Атмасферны ціск будзе падаць.

Потым два дні (22—23 студзеня) наша краіна будзе знаходзіцца пад уплывам малаактыўных франтальных раздзелаў і няўстойлівых паветраных мас. Чакаецца воблачнае з праяснennямі надвор'е. У сераду ноччу месцамі, днём у многіх раёнах краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У асобных раёнах прагназуюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўднёвай чвэрці ўмераны. Тэмпература паветра мінімальная ноччу ад мінус 3 да плюс 2 °С, а максімальная днём ад мінус 1 да плюс 4 °С.

У чацвер ноччу на большай частцы тэрыторыі, днём месцамі па краіне чакаюцца невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У асобных раёнах прагназуюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўднёвай чвэрці ўмераны, днём месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы мінус 3 — плюс 2 °С, удзень — ад мінус 1 да плюс 4 °С.

У пятніцу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі (дождж, мокры снег). Ноччу і раніцай месцамі будзе слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 2 °С, удзень — ад нуля да 5 °С.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у гэтыя выхадныя паступленне цёплага паветра ўзмоцніцца, а значыць, стане ўжо анамальна цёпла. Пры гэтым без ападкаў не абыдзецца, падкрэслілі сіноптыкі. У суботу месцамі па краіне невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Ноччу і раніцай у асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 2 °С, удзень — плюс 1—6 °С.

У ноч на нядзелю месцамі пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы, удзень чакаецца пераважна без ападкаў. Месцамі будзе слабы туман. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 3 °С, удзень — плюс 2—8 °С.

Сяргей КУРКАЧ.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 382000000007667 ад 30.04.2004. 220013. Мінск. праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 781. Індэкс 63850. Зак. № 84.

Нумар падпісаны ў 19.30 20 студзеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12